Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ЛІСТАПАДА 2015 г. ПЯТНІЦА № 225 (28083) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Медыкі пракансультуюць анлайн**

СТАР. 4



**Пра натхненне і літаратуру**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# НА ЗРАЗУМЕЛАЙ МОВЕ

## Партнёрства Беларусі і Сербіі набывае новыя грані, становіцца ўсё больш важкім і выніковым

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са сваім сербскім калегам Таміславам Нікалічам, які знаходзіцца ў Мінску з афіцыйным візітам.**

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Тамілсаву Нікалічу за падтрымку як на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах, так і на гэтых, і сербскаму народу за тое, што ў апошні час удалося прасунуцца ў адносінах.

Гаворачы аб гандлёва-эканамічных стасунках, Прэзідэнт Беларусі нагадаў аб пастаўленай перад урадамі дзвюх краін задачы па дасягненні аб'ёмаў узаемнага гандлю ў $0,5 млрд. У 2014 годзе краіны дасягнулі ўжо $250 млн тавараабароту. «Сёлета мы таксама прырастаем у нашым таваразвароце, так што, думаю, у найбліжэйшы час, прынамсі ў гэтай пяцігодцы, мы дасягнем таго ўзроўню, які з вамі намецілі. Я буду вельмі рады, і, думаю, вы таксама, калі нам прыйдзецца адкарэктаваць гэтую лічбу ў бок павелічэння», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Што тычыцца палітычных адносін, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што праблем таксама няма. «Мы заўсёды вас падтрымлівалі і будзем падтрымліваць, гэтак жа, як і вы, у міжнародных арганізацыях. Мы паабяцалі, што падчас вашага старшынства ў АБСЕ зробім максімум для таго, каб вы ніколі не сказалі, што мы былі пасіўныя ў гэты перыяд», — дадаў беларускі лідар.

Ён нагадаў, што Беларусь нядаўна наведваў міністр замежных спраў Сербіі. Адбылася канструктыўная гутарка, абмеркаваны многія пытанні, больш за ўсё закранালі тэму Украіны.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# МАЛАДЫЯ ПАРАСТКІ



Фота БЕЛТА.

**На базе Пачэпаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы сад — сярэдняя школа» Краснапольскага раёна школьнікі заклалі гадавальнік з пяці тысяч саджанцаў ігрушы, яблыні, вішні, чарэшні, маліны, парэчкі, буякоў. Гэта зроблена ў рамках праекта «Зялёная эканоміка для адраджэння вёскі», асноўная мэта якога — падтрымаць вітамінный прадукцыяй малазабяспечаныя сем'і ў раёнах краіны, пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі. Вучні самі даглядаюць новы сад: увосень, напрыклад, пад кіраўніцтвам загадчыка школьнай гаспадаркі Уладзіміра АНДРЫЯНАВА абразаюць саджанцы.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валянцін ЧЭКАНАЎ, міністр гандлю:**

*«Для гандлю ў сувязі з дэнамінацыяй ніякіх акругленняў і спекуляцый з павышэннем узроўню цэн быць не павінна. Роўна як і для пастаўшчыкоў. Трэба сёння стаць на абарону насельніцтва. Калі мы бачым, што тавар у гандаль паступае па цане на 5-15% вышэйшай, нельга маўчаць і прымаць гэты тавар. І ні ў якім разе не дапускаць павышэння цэн самімі аб'ектамі гандлю. Тут у нас наперадзе вялікі кавалак працы. Гэта два цэнікі, прывядзенне ў адпаведнасць, закупка касавых апаратаў, навучанне кадраў і гэтак далей. Падрыхтоўчая работа да дэнамінацыі будзе адной з цэнтральных задач на працягу першага паўгоддзя 2016-га».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17924,00 | ▲ |
| Еўра | 19131,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,22 | ▲ |
| Укр. грыўня | 751,53 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

Падпісацца на газету на I квартал 2016 года можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

**Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды!**

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# НА ЗРАЗУМЕЛАЙ МОВЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

«І ўсё, аб чым нас прасілі, мы свята выконваем, і не толькі таму, што гэта трэба рабіць, што мы паабяцалі, але яшчэ і таму, што Украіна — вельмі блізкая, родная нам краіна. І мы б хацелі, каб там заўсёды быў мір», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цэніць асабістыя сяброўскія адносіны, якія склаліся ў яго з Таміславам Нікалічам. На яго думку, яны шмат што значаць для адносін дзяржаў.

У сваю чаргу Таміслаў Нікаліч канстатаваў, што цяпер Сербія адчувае цяжкасці. «Вельмі цяжка ёй сёння ісці наперад пад цяжарам праблем, якія яна стварыла сама для сябе. І падтрымка Беларусі вельмі каштоўная для нас», — сказаў ён і падзякаваў беларускаму боку. Сербія цэніць і палітычную падтрымку Беларусі, улічваючы прынцыпы міжнароднага права, якіх яна прытрымліваецца ў знешняй палітыцы.

Прэзідэнт Сербіі выказаў надзею на трываласць рашэння ЕС па адмене санкцый супраць Беларусі. «Санкцыі — заўсёды ганьба для тых, хто іх уводзіць, а не для тых, у дачыненні да каго іх уводзяць, — падкрэсліў ён. — Санкцыі — знак бескантрольнай сілы». Таміслаў Нікаліч канстатаваў, што ЕС памыляўся, не супрацоўнічаючы з Беларуссю.

Лідары дзвюх краін абмеркавалі ўвесь спектр пытанняў двухбаковых адносін, пры гэтым акцэнт быў зроблены на выкананні раней пастаўленых кіраўнікамі дзяржаў задач. Прэзідэнты з задавальненнем канстатавалі, што ў Беларусі і Сербіі няма прынцыповых рознагалоссяў. Гэта тычыцца як пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, так і міжнароднага парадку дня.

«Мы дамовіліся, што ў найбліжэйшы час зможам распрацаваць нейкі перспектыўны план, або, як сёння модна казаць, дарожную карту супрацоўніцтва Беларусі і Сербіі на будучыню», — сказаў беларускі лідар. На яго думку, гэта стала б добрай асновай для далейшага развіцця супрацоўніцтва дзвюх славянскіх дзяржаў.

Прэзідэнты таксама дамовіліся, што на пасяджэнні міжурадавай камісіі бакі паспрабуюць вызначыць новыя напрамкі супрацоўніцтва, каб паскорыць і надаць маштабны характар эканамічным адносінам. Кіраўнік беларускай дзяржавы са шкадаваннем канстатаваў, што Беларусь і Сербія пакуль не ў поўнай меры выкарыстоўваюць патэнцыял інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатовая на дзяржаўным узроўні падтрымліваць прановы Сербіі па перспектыўных праектах у самых розных галінах. У прыватнасці, у сферы будаўніцтва, машынабудавання, дрэваапрацоўкі, сельскай гаспадаркі, харчовай прамысловасці. Ужо ёсць станоўчы прыклад прыцягнення сербскіх інвестыцый у эканоміку Беларусі. У прыватнасці, гаворка ідзе аб праекце будаўніцтва комплексу «Маяк Мінска», а таксама нядаўна ініцыяваным праекце «Мінск-Мір».

Адзначаецца стабільная станоўчая дынаміка развіцця адносін у гандлёва-эканамічнай сферы, галіне гуманітарнага супрацоўніцтва, узаемадзеяння на міжрэгіянальным узроўні.

Разам з тым працягваецца пошук новых эфектыўных формаў і перспектыўных напрамкаў сумеснай працы.

У той жа час Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што развіццё кааперацыйных праектаў — гэта «дарога з двухбаковым рухам». «Мы разлічваем на аналагічную падтрымку беларускіх інвестыцыйных праектаў, запланаваных да рэалізацыі на тэрыторыі Сербіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта Беларусі, значны патэнцыял двухбаковага ўзаемадзеяння маецца ў паліўна-энергетычнай сферы, сельскай гаспадарцы, машынабудаванні, будаўніцтве, удасканаленні транспартнай інфраструктуры, сферы навукі, адукацыі, турызме.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што Беларусь і Сербія знаходзяцца на тым этапе выстройвання адносін, калі ў бакоў ёсць разуменне неабходнасці пераходу ад простых тавараабменных аперацый да больш складаных і эфектыўных кааперацыйных формаў прамысловага, навукова-тэхнічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва. Ён адзначыў, што ў Сербіі ўжо дзейнічаюць зборачныя вытворчасці беларускіх трактароў, аўтобусаў, грузавых аўтамабіляў, якія знайшлі сваю нішу на рынку Сербіі і краін Балканскага рэгіёна. Намечаны таксама перспектыўныя праекты сумесных вытворчасцяў па выпуску пажарных машын і сельскагаспадарчай тэхнікі.

Прэзідэнт Беларусі запрасіў прадпрымальнікаў Сербіі да рэалізацыі праектаў у Беларусі. На думку Аляксандра Лукашэнкі, для гэтага цяпер ёсць добры шанц. «Прыходзьце, давайце будзем развіваць тут тое, што цікавіць Сербію. Давайце мы будзем тое, што вам цікава, стварыць разам з вамі на вашай тэрыторыі і гандляваць з іншымі дзяржавамі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

На думку беларускага лідара, удзел Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе і наяўнасць у Сербіі рэжыму свабоднага гандлю з Еўрасаюзам і краінамі Балканскага рэгіёна ствараюць спрыяльныя ўмовы для нарошчвання патэнцыялу беларуска-сербскага гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь нязменна разглядае Сербію ў якасці ключавога гандлёва-эканамічнага партнёра на Балканах.

«Беларусь падтрымлівае тэрытарыяльную цэласнасць Сербіі і вітае намаганні сербскага кіраўніцтва па нармалізацыі сітуацыі ў краі Косава і Метохія для забеспячэння мірнага і шчаслівага жыцця ў гэтым рэгіёне», — сказаў беларускі лідар.

«Падводзячы папярэднія вынікі праведзеных перамоў, магу з упэўненасцю сказаць, што партнёрства нашых краін набывае новыя грані, становіцца ўсё больш важкім і выніковым», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён выказаў упэўненасць, што цяперашняя сустрэча прынясе значныя вынікі ўжо ў самы блізкі час.

Па выніках перамоў у Мінску Аляксандр Лукашэнка і Таміслаў Нікаліч падпісалі сумесную заяву, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. У дакуменце прэзідэнты высока ацанілі вынікі супрацоўніцтва і прагрэс у розных галінах, дасягнутыя пасля сустрэчы на вышэйшым узроўні ў 2014 годзе ў Бялградзе, пацвердзілі ўзаемную зацікаўленасць у далейшым падтрыманні рэгулярнага палітычнага дыялогу, удасканаленні дзейных і стварэнні новых механізмаў беларуска-сербскага ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай сферы, пашырэнні дагаворна-прававой базы супрацоўніцтва, а таксама прыхільнасць дзвюх краін захаванню агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права.

## ■ Парламенцкі дзённік

# ДЗЯРЖПАДТРЫМКА МАЛОГА БІЗНЕСУ ПАШЫРЫЦЦА

### А за нявыплату падатку за сацыяльнае ўтрыманства давядзецца заплаціць штраф

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на чарговым пасяджэнні разгледзелі 12 законапраектаў і адну пастанову. Асноўнымі тэмамі сталі спажывецкая кааперацыя, барацьба з сацыяльным утрыманствам і падтрымка малога і сярэдняга бізнесу.**

## ПРАДПРЫЕМСТВЫ БЕЛКААПСАЮЗА ЗМОГУЦЬ ЗАЙМАЦЦА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВАМ

Праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях спажывецкай кааперацыі» быў прыняты ў першым чытанні.

**Старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Валерый ІВАНОЎ** звярнуў увагу парламентарыяў на сацыяльную функцыю спажывецкай кааперацыі. Ён падкрэсліў, што спажывецкая кааперацыя «здзяйсняе адну з асноўных задач па забеспячэнні жыццядзейнасці вясковага насельніцтва краіны, задавальняючы яго патрэбы ў таварах і паслугах». Сёння Белкаапсаюз аб'ядноўвае 258 юрыдычных асоб і іх філіялы — гэта спажывецкія таварыствы, рэспубліканскія і абласныя саюзы, гандлёвыя, вытворчыя, нарыхтоўчыя, зверагадоўчыя, сельскагаспадарчыя, транспартныя, будаўнічыя прадпрыемствы і ўстановы адукацыі.

— У шэрагі кааператараў уваходзіць каля 700 тысяч пайшчыкаў, — паведаміў Валерый Іваноў. — Нашымі гандлёвымі арганізацыямі абслугоўваецца прыкладна 36% насельніцтва краіны.

Як заўважыў выступоўца, арганізацыя працуе ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі.

— Развіццё і ўкараненне сеткавых гандлёвых структур цягне за сабой скарачэнне ўдзельнай вагі спажывецкай кааперацыі ў зоне абслугоўвання рэгіёна. Разам з тым мы не стаім на месцы. Гандлёвае абслугоўванне насельніцтва ажыццяўляюць больш за 10 тысяч рознічных гандлёвых аб'ектаў.

Спажывецкая кааперацыя выконвае даручэнне кіраўніка дзяржавы па паляпшэнні абслугоўвання аўтакрамамі жыхароў сельскіх населеных пунктаў. 800 магазінаў на колах абслугоўваюць каля 15 тысяч вёсак.

— Гэтым законапраектам прадугледжана ўнясенне дапаўненняў і змен у Грамадзянскі кодэкс і ў Закон «Аб спажывецкай кааперацыі». У сувязі з тым, што саюзы спажывецкіх таварыстваў непасрэдна здзяйсняюць некаторыя віды прадпрымальніцкай дзейнасці, артыкул 121 Грамадзянскага кодэкса прапануецца дапоўніць нормай, якая прадугледжвае магчымасць устанаўліваць заканадаўчымі актамі права саюза на ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці.

Адказваючы на пытанне **дэпутата Вольгі ПАЛІЦІКІ, члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі**, якое тычылася матывацыі людзей станавіцца пайшчыкамі Белкаапсаюза, Валерый Іваноў адзначыў, што ў некаторых райкаапсаюзах колькасць пайшчыкаў зніжаецца. Гэта звязана з агульным змяншэннем колькасці сельскіх жыхароў у краіне.

— Выконваючы нейкую сацыяльную функцыю, атрымаць вялікі прыбытак, а пасля яго перарамеркаваць і налічыць на выкупленны пай амаль немагчыма, ды і немэтазгодна, — адзначыў старшыня Белкаапсаюза. — У той жа час велічыня пая невялікая — гэта прыкладна 25-30 тысяч рублёў. Зыходзячы з гэтай сітуацыі, мы спрабуем укараніць нешта новае, каб зацікавіць людзей у набыцці нашага пая.

## ПЫТАННІ ЗАНЯТАСЦІ

У першым чытанні дэпутаты прынялі праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных парушэннях». Гэты дакумент быў распрацаваны для выканання палажэнняў Дэкрэта Прэзідэнта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства».

Праект закона прадугледжвае, што за ўхіленне ад выплаты так званага «падатку на дармаедства», а таксама за няпоўную яго выплату, законам прадугледжваецца адміністрацыйнае пакаранне або адміністрацыйны арышт.

Акрамя таго, дакумент прапануе ўзмацніць адказнасць наймальнікаў за парушэнне заканадаўства аб занятасці насельніцтва.

## КРЫНІЦЫ ФІНАНСАВАЙ ДАПАМОГІ

У першым чытанні быў прыняты праект закона, што ўносіць змены і дапаўненні ў Закон «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва». Папраўкі маюць як тэрміналагічны, так і дадатковы характар.

— Адкарэктавана тэрміналогія закона, — паведаміў **міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ.** — Калі раней у нас дзейнічалі таварыствы ўзаемнага крэдытавання суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, то цяпер такія арганізацыі, згодна з Указам №325, сталі называцца таварыствамі ўзаемнага фінансавання суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Акрамя таго, у артыкуле 23 у адпаведнасці з указам удакладнена, што названымі таварыствамі фінансавая дапамога можа прадастаўляцца толькі ў форме мікрапазык, то бок адна мікрапазыка не павінна перавышаць 15 тысяч базавых велічынь, што складае на сёння 2,7 мільярда рублёў. Таксама ўдакладнены крыніцы фінансавай дапамогі — сродкі таварыства могуць фарміравацца цяпер не толькі за кошт сродкаў яго членаў, але і за кошт іншых незабароненых крыніц, напрыклад пазык.

Праект закона таксама ўдакладняе мэты фінансавання.

— Пашыраецца сфера аказання дзяржаўнай фінансавай падтрымкі, — паведаміў міністр. — Яна можа прадастаўляцца арганізацыям, у статутным фондзе якіх доля дзяржавы, замежных асоб і юрыдычных асоб, якія не з'яўляюцца суб'ектамі малога прадпрымальніцтва, не перавышае 49% (раней было 25).

* * *

Акрамя вышэйназваных законапраектаў, учора дэпутаты разгледзелі і прынялі праект пастановы Палаты прадстаўнікоў «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 кастрычніка 2015 года №6 «Аб унясенні змен у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», а таксама ратыфікавалі шэраг міжнародных дакументаў. У другім чытанні былі прыняты законы, што ўносяць змены і дапаўненні ў Закон «Аб грамадзянстве», у некаторыя законы нашай дзяржавы па пытаннях абароны навакольнага асяроддзя, удзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# У ГРОДНЕ ПАБУДУЮЦЬ ФУТБОЛЬНЫ МАНЕЖ

**Памятны знак на месцы ўзвядзення крытага футбольнага манежа, дзе сцены і дах будуць з надзіманых канструкцый, устанавілі ў гродзенскім лесапарку Пышкі.**

Гэта сумесны праект асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» і мясцовых улад. Усе падрыхтоўчыя работы фінансуе мясцовы бюджэт, а затраты па паветраапорным купале і штучным пакрыцці пляцоўкі — за кошт БФФ. Падобны манеж пабудавалі ў Мінску, і вось пачынаецца іх узвядзенне ў абласных цэнтрах.

— З Гродна распачынаем таму, што мясцовыя ўлады праявілі вялікую зацікаўленасць у гэтым аб'екце і апературна вырашылі ўсе пытанні, — сказаў **старшыня Беларускай федэрацыі футбола Сяргей РУМАС.**

Такім чынам, у Пышках ствараецца выдатная спартыўная і аздараўленчая база: ужо ёсць крыты лядовы каток, трэнажоры пад адкрытым небам, веладарожкі, пункты пракату спортінвентару.

— Прыемна, што тут з'явіцца і футбольны манеж, які, спадзяюся, дасць штуршок развіццю гэтага віду спорту, — зазначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.**

Будаўніцтва манежа (з трыбунамі на 1000 гледачоў) плануецца завяршыць у сярэдзіне наступнага года. Дарэчы, яго можна будзе выкарыстаць і для правядзення выстаў, канцэртаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# НА ТЭРЫТОРЫЮ ДЗІЦЯЧАГА САДКА ТРАПІЎ СНАРАД

### Боепрыпас абясшкоджаны

**Надзвычайнае здарэнне адбылося ў дзіцячым садку №40, які знаходзіцца па вуліцы Ракасоўскага ў Пінску. 214 дзяцей і дарослых давялося эвакуяваць. Гэта было зроблена арганізавана і аператыўна.**

Пасля абеду, калі дзеці адправіліся на «ціхі час», рабочы ўстановы пачаў раскідваць зямлю, якую завезлі для клумбаў. Мужчына заўважыў прадмет, які вельмі нагадваў снарад. Адразу патэлефанавалі ў міліцыю. На месца прыбылі супрацоўнікі спецыяльных службаў і арганізавалі эвакуацыю 168 выхаванцаў і 46 супрацоўнікаў. Да прыбыцця сапёрнай групы тэрыторыю дзіцячага садка ачапілі.

Снарад часоў вайны, які аказаўся боепрыпасам ад нямецкага мінамёта, сапёры вывезлі і знішчылі.

Як расказала карэспандэнту газеты **загадчыца дзіцячай дашкольнай установы Таццяна СТАРЧАНКА**, на наступны дзень садок ужо працаваў у звычайным рэжыме.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# УВАГА, «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

### Усё пра нерухомасць

**26 лістапада**, у чацвер, у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца **«прамая лінія» са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі**

## Андрэем Анатольевічам ГАЕВЫМ

Пытанні, якія тычацца правілаў і новых тэрмінаў дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, нюансаў ацэнкі дамоў і зямельных участкаў, а таксама ўсяго іншага, што звязана з зямельнымі надзеламі фізічных асоб, можна будзе задаць **з 15 да 16** гадзін **па тэлефоне (8-017) 287-18-71.**

Папярэдне свае пытанні магчыма пакінуць **па нумары (8-17) 287-17-51** альбо даслаць **на электронную пошту kurkach@zviazda.by** з пазнакай «Прамая лінія».

■ На думку парламентарыя

Дэпутат Валерый ГАЙДУКЕВІЧ:

# «З ТЭРАРЫСТЫЧНАЙ ПАГРОЗАЙ ТРЭБА ЗМАГАЦЦА ЎСІМ СВЕТАМ»

**31 кастрычніка тэрарысты ўзарвалі расійскі самалёт, 13 лістапада забілі 132 чалавекі ў Францыі. «Чорная пятніца» ў Парыжы — трагедыя, перасцярога не толькі для адной краіны, але і для ўсяго свету. Суразмоўца «Звязды» — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Валерый Гайдукевіч, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы, упэўнены: з той пагрозай, якую нясе «Ісламская дзяржава», усім краінам трэба змагацца разам.**



Фота БЕЛТА.

***— Прыхільнікі «Ісламскай дзяржавы» — гэта людзі, якія прапаведуюць самую радыкальную трактоўку ісламу,*** — гаворыць дэпутат. ***— Заўважце, практычна ўвесь цывілізаваны ісламскі свет адасобіўся ад іх.***

Тым не менш ІД сёння мае дастаткова вялікі ўплыў. Тыя, хто ўчыніў тэракт у Францыі, хто падарваў сябе, з'яўляюцца выхадцамі з Францыі, Бельгіі, яны не прыезджыя. Гэта людзі, якія выраслі на французскай зямлі. «Ісламская дзяржава» сфарміравалася на тэрыторыі Сірыі і Ірака, але ёсць дастаткова шмат людзей з Еўропы, у тым ліку з Расіі, якія ваююць на яе баку. Яны прайшлі падрыхтоўку, частка іх вярнулася ў свае краіны. На гэтую праблему спецслужбы звярнулі ўвагу не так даўно і пачалі разбірацца: хто з'ехаў, хто і з тым вярнуўся або вяртаецца. Але, відаць, нешта недагледзелі, таму што тыя жудасныя рэчы, якія адбыліся ў Парыжы, нават уявіць страшна.

Для прыхільнікаў «Ісламскай дзяржавы» няма нічога святога. Калі браць гісторыю, у тым ліку вайнаў, то можна ўбачыць, што ваявалі паміж сабой арміі. І яны, за выключэннем фашыстаў, як правіла, не імкнуліся да знішчэння мірнага насельніцтва. Цяпер жа пацярпелі тыя людзі, якія ніякага дачынення да прыняцця рашэнняў аб бамбардзіроўцы «Ісламскай дзяржавы» ніколі не мелі. Яны проста мірна жылі, і атрымалася так, што менавіта яны апынуліся на пярэднім краі гэтай барацьбы. Так вырашылі тэрарысты.

Зараз, я думаю, будуць пановаму пераасэнсаваны пытанні, звязаныя з бяспекай, з міжнароднымі адносінамі: з тэрарыстычнай пагрозай трэба змагацца ўсім светам. І тое, што сказаў прэзідэнт Расіі, пачынае асэнсоўвацца па-іншаму. Пуцін прапаноўваў: давайце разам разбярэмся з гэтай з'явай, будзем змагацца разам. Але ўсе маўчалі... Задача ў прыхільнікаў ІД адна — запалохаць свет, прапаведаваць свае радыкальныя ідэі. Для такіх дзяржаў, як Расія, дзе шмат мусульман, або як Казахстан, дзе асноўная рэлігія — іслам, такая прапаганда — гэта дастаткова сур'ёзная пагроза. Думаю, у найбліжэйшы час будуць прыняты адэкватныя рашэнні, у прыватнасці, па абмене інфармацыяй аб перамяшчэннях асоб, якія могуць мець дачыненне да «Ісламскай дзяржавы».

***— Сёлета ў Францыі ўжо былі тэракты, калі расстралялі журналістаў карыкатурнага часопіса, атакавалі завод каля Ліёна...***

— Заўсёды трэба вельмі акуратна ставіцца да такіх сітуацый, калі загадзя нешта вядома. Пагрозы ў адрас часопіса гучалі, аднак не было адпаведнага рэагавання службаў бяспекі. Гэта не жарты, а сур'ёзныя рэчы. Калі імі не займацца, то гэта прывядзіць да жудасных наступстваў.

***— Апошні месяц быў насычаны тэрактамі. Ці варта баяцца паўтарэння гэтых падзей?***

— Калі сёння не аб'яднаць намаганні на супрацьдзеянні пагрозе, якая зыходзіць ад «Ісламскай дзяржавы», то гэта можа прывесці да паўтору тэрактаў. Аб'яднанне намаганняў трэба правесці максімальна хутка — гэта па-першае. Па-другое, трэба стварыць агульны банк з даных усіх, хто мае ці меў дачыненне да ІД.

Эмісары падарожнічаюць па розных краінах з мэтай прыцягнуць на свой бок людзей. Досыць шмат ужо пайшлі за імі і прайшлі падрыхтоўку. Цяпер цяжка давесці, дзе гэтыя людзі. Абмен адпаведнай інфармацыяй, звязанай з перамяшчэннем такіх людзей, неабходны.

***— Можна канкрэтызаваць, якія менавіта захады бяспекі ўзмоцнены альбо будуць узмоцнены ў нашай краіне?***

— Асаблівую ўвагу службы бяспекі надалі метро, аэрапортам, дзе праводзіцца больш пільны агляд. Заўважце, да гэтага часу не выявілі, як выбухоўка трапіла на борт расійскага самалёта ў Егіпце. Зараз задача не толькі ўзмацніць меры бяспекі — гэта бачная частка працы. Досыць вялікі аб'ём работ праводзіцца спецыяльнымі аператыўнымі службамі, якія правяраюць, падымаюць усе звесткі — хто, калі і куды ездзіў.

***— Што тычыцца заканадаўства, у нас ёсць закон «Аб барацьбе з тэрарызмам». Ці плануецца яго новая рэдакцыя ў сувязі з нядаўнімі падзеямі?***

— Справа ў тым, што ў наступным годзе запланавана пры неабходнасці карэкціроўка гэтага закона. Але пакуль адпаведнай заканадаўчай ініцыятывы — ад Прэзідэнта, Савета Міністраў або дэпутатаў — не паступала.

У цэлым гэты закон ужо добра прапрацаваны. Але справа ў тым, што час ідзе, і ўзнікае неабходнасць ва ўдакладненнях. Пакуль асобнай гутаркі аб рэдакцыі Закона «Аб барацьбе з тэрарызмам» не было, трэба асэнсаваць апошнія падзеі і высветліць, чаго ў нашым законе не хапае. У прынцыпе ён дазваляе спецыяльным службам выконваць тыя задачы, якія ўскладзены на іх.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

■ Круглы стол

# КІТАЙ — БЕЛАРУСЬ: НА НОВЫ МАСТАЦКІ ЎЗРОВЕНЬ

**У Выдавецкім доме «Звязда» прайшоў круглы стол «Кітайская літаратура ў Беларусі».**



Фота Надзеі БУЖАН.

Для ўдзелу ў размове пра сённяшні стан беларуска-кітайскіх літаратурных адносін, сувязяў у галіне перакладу сабраліся літаратуразнаўцы, перакладчыкі, паэты. Што стала прадметам абмеркавання, дыскусіі? Пра гэта расказвае **мадэратар круглага стала, рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Полымя» Юлія АЛЕЙЧАНКА:**

— Запрасіўшы розных экспертаў разгледзець сённяшнюю прысутнасць кітайскай літаратуры ў Беларусі, мы асаблівую ўвагу звярнулі на ўжо зробленае. Толькі за апошнія тры гады ў адным Выдавецкім доме «Звязда» выйшла некалькі кніг кітайскіх аўтараў: анталогія паэзіі «Пад крыламі Дракона: Сто паэтаў Кітая», зборнік паэзіі і прозы «Стагоддзе на знаёмства», кнігі ў серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая» — Ван Вэя, Лі Бо, Ду Фу, Ай Ціна, зборнік публіцыстыкі «Беларусь вачыма кітайцаў». Пагадзіцеся, сапраўдная бібліятэка!.. А зазірніце на старонкі часопіса «Полымя»... Мы неаднойчы друкавалі кітайскую паэзію ў перакладах на беларускую мову. Часопіс займаецца гэтым не ад выпадку да выпадку. І пэўным этапам развіцця на гэтым шляху з'яўляецца публікацыя падборкі старажытнага паэта Лі Хэ ў перакладзе Алены Раманоўскай. Заўважу: пераклады зроблены з арыгінала. Што цікава, Лі Хэ амаль невядомы на рускай мове. Веру, што кніга гэтага творцы стане падзеяй, трывалым мостам у беларуска-кітайскіх літаратурных сувязях.

Такая творчая праца ўражвае, з'яўляецца асновай ужо для работы літаратразнаўцаў, гісторыкаў літаратурнага працэсу. Пра гэта і гаварылі на круглым стале кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры кітайскай філалогіі Белдзяржуніверсітэта Мікалай Хмяльніцкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ Міхась Кенька, паэт, перакладчык, галоўны дырэктар замежнага вяшчання «Беларускага радыё» Навум Гальпяровіч, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч.

— Прыемна ўражвае, што беларуска-кітайскі мастацкі, літаратурны камунікат сёння істотна ўмацоўвае, пашырае творчая моладзь, — заўважыў **Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.** — Тая моладзь, якая адкрывае для сябе Кітай непасрэдна ў стасунках з кітайцамі, якая часта наведвае Кітай. У ранейшыя, часам вельмі даўнія дзесяцігоддзі ў Паднябеснай пабывалі беларускія паэты, празаікі Максім Танк, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Янка Брыль... Пасля — перапынак. Цяпер — усплёск. Беларуская студэнцкая, аспіранцкая моладзь вучыцца ў розных кітайскіх ВНУ, удзельнічае ў навуковых канферэнцыях, знаёміцца з кітайскімі бібліятэкамі.

— На мой погляд, наспеў той час, — сказаў **літаратуразнаўца Мікалай ХМЯЛЬНІЦКІ,** — калі беларуская літаратурна-мастацкая прастора можа і павінна выйсці на новы ўзровень рэцэпцыі кітайскай літаратуры...

— І пры гэтым нельга забывацца пра папярэднія этапы, папярэдні вопыт, — нагадаў **Міхась КЕНЬКА**. — Хачу прывесці цікавы прыклад. Ужо шмат гадоў, як пайшла з жыцця выдатная беларуская паэтэса Анэля Тулупава. А, між тым, яна падрыхтавала, уклала цэлую кнігу перакладаў легендарнай кітайскай паэтэсы Лі Цынжао. Разам з ёю, Анэляй Тулупавай, над перакладамі працавалі Вольга Іпатава, Ніна Загорская, Яўгенія Янішчыц. Але і гэтая ўнікальная кніга перакладаў усё яшчэ застаецца ў рукапісе. Добра, што працу захавалі родзічы Анэлі Тулупавай у сваім дамашнім архіве. Чаму б беларускую кнігу Лі Цынжао не выдаць у «звяздоўскай» серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая»?

...Круглы стол у Выдавецкім доме «Звязда» па беларуска-кітайскіх літаратурных сувязях абазначыў цэлы шэраг існуючых праблем і магчымых перспектыў. Для іх актуалізацыі, для таго, каб засведчыць выразныя спробы, падыходы да іх вырашэння, несумненна, варта стварыць пастаянна дзеючы дыскусійны семінар, напрыклад, з той жа назвай — «Кітайская літаратура ў Беларусі». Чаму б не рэалізаваць гэты творчы і арганізацыйны, культуралагічны праект на пляцоўцы Выдавецкага дома «Звязда»?

**Міхаіл ЛАДЫНІН**

■

■ Надвор'е

# У НЯДЗЕЛЮ ЧАКАЕЦЦА МОКРЫ СНЕГ

**Сёння тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, а ў выхадныя да нас завітае сапраўды халоднае надвор'е паўночных шырот, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

У пятніцу часам пройдуць дажджы. У некаторых раёнах слабы туман. Чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 5-10 градусаў. У суботу надвор'ем пачнуць кіраваць няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступаюць з Балтыйскага мора. Ападкі ў выглядзе дажджу будуць мець кароткачасовы характар. Месцамі туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад 0 да плюс 7 градусаў.

І ў нядзелю амаль паўсюдна па краіне захаваецца ўплыў зоны паніжанага ціску. Па паўднёвым усходзе адаб'ецца ўплыў актыўных атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы, адкуль пачне паступаць больш халоднае паветра паўночных шырот. Таму ўначы месцамі, а ўдзень пераважна па паўднёвым усходзе пагражаюцца кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег). У некаторых раёнах туман, слабы галалёд. Пахаладае. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да мінус 4 градусаў, па паўднёвым усходзе — каля нуля, удзень — ад нуля да 5 цяпла.

У панядзелак на большай частцы тэрыторыі чакаецца пераважна мокры снег. Месцамі слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 1 марозу да 4 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 22 декабря 2015 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания столовой, расположенного по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 157, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Электроаппаратура» на праве собственности**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание столовой, инв. №350/С-163382** | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Двухэтажное кирпичное строение, 1976 года постройки. Общая площадь 2646,0 м.кв. *Составные части и принадлежности: подвал, венткамера, три крыльца.* **Часть здания на 1-м этаже сдана в аренду для размещения двух банкоматов:** 2,0 м.кв. сроком по 31.03.2016 г., 2,0 м.кв. сроком по 31.03.2016 г. | **8 286 000 000** | **500 000 000** |
| ***Земельный участок** для эксплуатации и обслуживания здания на праве аренды площадью **0,1966 га** с кадастровым номером 340100000002005474. Договор аренды земельного участка сроком по 28.02.2048 г. с ГУ Администрация СЭЗ «Гомель-Ратон». Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 21 декабря 2015 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели, а также физические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **22 декабря 2015 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. **Шаг аукциона – 5%.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить объект.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 20 ноября 2015 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере одного процента от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 15 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Электроаппаратура», г. Гомель, ул. Советская, 157. • 8 (0232) 57-91-13, 8 (029) 657-01-42**

■ Як гэта працуе?

# АХОВА ЗДАРОЎЯ «ПА ВЕРТЫКАЛІ»

**У шэрагу суседніх краін ужо забыліся, што такое ФАП або ўчастковая бальніца. У нас яны захоўваюцца і сёння лічацца мэтазгоднымі ў сельскай мясцовасці. Разам з тым ёсць і новаўвядзенні. Год ад года пашыраецца практыка аказання першаснай медыцынскай дапамогі «трыядай» спецыялістаў — урачом агульнай практыкі, памочнікам урача і медыцынскай сястрой. Як увогуле размяркоўваецца медыцынская дапамога «па вертыкалі»?**



**Фельчарска-акушэрскіх пунктаў** па краіне — 2188. Гэта самая набліжаная да насельніцтва даўрачэбная медыцынская дапамога — стабільная і даступная для сельскага жыхара.

— Нават калі ў населеным пункце засталося сто жыхароў, мы імкнёмся захаваць там медработніка, — тлумачыць **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі — начальнік аддзела пярвічнай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — Мы зараз кажам пра фельчараў, якія добра ведаюць мясцовае насельніцтва, што, у сваю чаргу, вельмі высока ацэньвае работу фельчараў. На ўсіх ФАПах былі праведзены рамонтныя работы, іх забяспечылі цэнтралізаваной падачай цяпла і вады, прадаставілі і медыцынскі інструментарый для выканання невялікіх маніпуляцый — тут можна памераць артэрыяльны і вочны ціск, узровень цукру, выконваецца і электракардыяграма, а таксама ёсць адпаведны набор лекавых сродкаў.

**Урачэбных амбулаторый і амбулаторый урача агульнай практыкі** налічваецца 118 і 530 адпаведна. Урачы агульнай практыкі, якія працуюць у такіх амбулаторыях, могуць выконваць і пэўныя хірургічныя маніпуляцыі, і маніпуляцыі, звязаныя з афтальмалагічнай або лор-практыкай, валодаюць досыць шырокімі ведамі ў галіне неўралогіі і некаторых іншых тэрапеўтычных спецыяльнасцяў. Гэта дазваляе аказаць пацыенту пэўны комплекс паслуг, па якія ўжо не трэба будзе ехаць у цэнтральную раённую бальніцу да вузкага спецыяліста. Аднак пры неабходнасці ўрач агульнай практыкі цалкам мае права накіраваць на любы іншы, хоць бы і рэспубліканскі, узровень аказання медпамогі.

— У Астравецкім раёне мы ажыццявілі пілотны праект, які пачынае ўкараняцца ва ўсёй краіне. Ён звязаны з тэлемедыцынскімі тэхналогіямі ў рабоце ўрача агульнай практыкі, які, па сутнасці, працуе ва ўмовах прафесійнай ізаляцыі. Спецыялісты Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі кансультуюць іх у рэжыме анлайн па нейкіх няпростых сітуацыях. Гэта зніжае верагоднасць пастаноўкі няправільнага дыягназу. Выконваецца, дарэчы, і тэлемедыцынская электракардыяграма. Той жа фельчар можа перадаць вынік абследавання ў раённы ці абласны цэнтр, каб не прапусціць востры каранарны сіндром і своечасова даставіць пацыента ў бальніцу.

**Участковых бальніц і бальніц сястрынскага догляду** па краіне — 144 і 104 адпаведна. Нярэдка побач з такімі ўстановамі знаходзіцца амбулаторыя ўрача агульнай практыкі, што лічыцца найбольш аптымальным варыянтам.

— Чаму мы захавалі ўчастковыя бальніцы? Таму што на вёсцы пражывае пераважна пажылое насельніцтва, а пажылыя звычайна маюць высокі ўзровень камбінацый розных захворванняў, — кажа Людміла Жылевіч. — Сталы чалавек можа досыць працягла знаходзіцца ў падобнай установе, і гэта важна, бо яму звычайна цяжка пагадзіцца на знаходжанне ў інтэрнаце: неабходны звыклыя ўмовы і мясціны. Сельская ахова здароўя вельмі цесна працуе і з сацыяльнымі службамі. Спецыяльны праект у Гомельскім рэгіёне дазволіў адпрацаваць варыянты ўзаемадзеяння ўрачоў агульнай практыкі з сацыяльнай службай, падрыхтаваць адпаведным чынам сацыяльных работнікаў.

**Цэнтральных раённых бальніц** у нас 107. Тут ужо з'яўляюцца спецыялізаваныя віды медпамогі. Сюды, як правіла, уваходзяць паліклінікі, у якіх ёсць урач-хірург, акушэр-гінеколаг, лор-урач, афтальмолаг і іншыя.

— Але адна бальніца можа абслугоўваць 50 тысяч чалавек, а іншая — 15 тысяч, так што не паўсюль неабходны вялікі аб'ём спецыялізаванай дапамогі. Таму актыўна ствараюцца міжраённыя медцэнтры. Скажам, няма сэнсу трымаць уролага медустанове, якая абслугоўвае 15 тысяч насельніцтва — дастаткова ўрача-хірурга. А вось на базе міжраённага цэнтра працуюць ужо адразу некалькі ўролагаў і ёсць адпаведная матэрыяльна-тэхнічная база для выканання шэрагу хірургічных маніпуляцый.

**Медустановы абласнога і рэспубліканскага ўзроўню** забяспечваюць высокатэхналагічную медпамогу, тут працуюць і рэдкія спецыялісты, якія, укараняючы пэўныя метадыкі, дзеляцца пасля вопытам іх прымянення з урачамі той жа цэнтральнай раённай бальніцы. Гэта шэраг дыягнастычных і лячэбных маніпуляцый (малаінвазіўныя тэхналогіі) кшталту камп'ютарнай тамаграфіі або эндапратэзавання.

— Выдзяленне матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў для першаснай аховы здароўя адбываецца за кошт пераразмеркавання сродкаў, — падсумоўвае спецыяліст Міністэрства аховы здароўя. — Актыўна ўкараняецца інфарматызацыя, усе ўрачы агульнай практыкі аснашчаны інфармацыйнымі тэхналогіямі. Урэшце, калі завершыцца працэс інфарматызацыі з арганізацыяй электроннай амбулаторнай карткі, то ўжо не важна будзе, дзе менавіта мы знаходзімся — у глыбінцы ці ў сталіцы. Любы ўрач зможа, пагледзеўшы электронную картку, удакладніць лячэнне і г.д.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

### ПРА КАДРЫ І ДАСТУПНАСЦЬ

Па занятых пасадах укамплектаванасць медустаноў складае да 97 працэнтаў. Сельская ахова здароўя мае менш праблем з сярэднім медперсаналам, больш — са спецыялізаванымі службамі. Крытычнай сітуацыі сёння няма нідзе, але цалкам не выключаны кароткачасовыя затрымкі з пошукам таго ж фельчара (калі былы, скажам, звольніўся ці змяніў месца жыхарства). Але на даступнасць меддапамогі гэта не ўплывае. Цэнтральная раённая бальніца або амбулаторыя адразу распісваюць графік наведвання той установы, у якой няма спецыяліста. Акрамя таго, развіваецца сістэма перасоўных ФАПаў і лабараторый, а на замену перагружанай у нейкі момант хуткай дапамозе можа прыехаць фельчар або ўрач агульнай практыкі.

### ПРА ВУЗКІХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Практыка паказала, што да 70% выпадкаў не маюць патрэбы ў кансультацыі вузкага спецыяліста — з сітуацыяй цалкам можа справіцца і ўчастковы тэрапеўт. Таму сёння «прывязка» да вузкага спецыяліста ажыццяўляецца толькі праз урача агульнай практыкі. Іншая справа — урачы так званага прамога кантакту: гінеколаг, траўматолаг, хірург, аталарынголаг і афтальмолаг. Скажам, з болем у вуху ці свербам у воку няма сэнсу ісці спачатку да тэрапеўта. І наадварот, з болем у спіне ці паколваннем у сэрцы зусім не абавязкова ісці да неўролага ці кардыёлага: разабрацца з праблемай спачатку павінен тэрапеўт. Парушэнне гэтага парадку даводзіць да абсурду: у хворых на руках назапашваецца і старанна захоўваецца безліч кансультатыўных заключэнняў вузкіх спецыялістаў, але людзі не ведаюць, што з гэтым рабіць.

### ПРА НОВУЮ КАМАНДУ

Падрыхтаваны ўжо 292 памочнікі ўрача, і колькасць такіх спецыялістаў будзе расці. Участковыя ўрачы знаходзяцца на этапе перанавучання. Такім чынам, на пярвічным узроўні будуць працаваць не ўчастковы ўрач і медсястра, а перанавучаны ўрач агульнай практыкі, памочнік урача і медсястра. Урач агульнай практыкі возьме на сябе частку функцый вузкіх спецыялістаў. Медыцынская сястра будзе выконваць функцыі «менеджара» — званіць, выклікаць, тлумачыць. А памочнік урача можа нават весці прыём у асобным кабінеце. Акрамя таго, ён будзе патраніраваць пацыентаў з хранічнымі захворваннямі. Укараненне падобнай практыкі пачалося тры гады таму.

■

■ Неасабісты суб'ектыў

# Мелодыі старога палаца



## Пра старую кафлю, кроплю прыкрасці і тое, як, ратуючы, не загубіць канчаткова

У ЖАМЫСЛАЎЛІ мне давялося быць роўна шаснаццаць гадоў назад. Тады таксама была позняя восень, празіліва-даждлівае надвор'е, ранняя прыцемкі. Вандруючы з «выязной прыёмнай» «Звязды» па ўсім Іўеўскім раёне, мы заехалі ў мястэчка спецыяльна — пагледзець палац. І, як на заказ, акурат у тыя паўгадзіны сярод панылай дажджлівай рапам выглянула нізкае лістападаўскае сонца, касымі прамянямі падсвяцілі аголены стары сад і брудна-белую пляму палаца ў ім. Быццам нехта зверху захацеў, каб мы як мага лепш разгледзелі ўсю яго прыгажосць і занядбанасць.

І мы глядзелі ва ўсе вочы на двухпавярховы будынак дзівоснай урачыстай архітэктуры — так будавалі толькі ў старажытнай Грэцыі ды ў эпоху класіцызму. Высокія стройныя калоны, бельведэр, вялікія вокны. Здавалася, калі прыслухацца, з іх загучыць вальс ці паланэз. Але ўслед за першым уражаннем прыходзіла разуменне, што нічога падобнага тут не было ўжо даўно і быць не можа. Бо на калонах аблупілася тынкоўка, бельведэр стаў шчарбатым, а палова вокнаў была забіта дошкамі.

Тады, у 1999-м, у палацы месцілася калгасная кантора, а на другім паверсе быў клуб, дзе вясковая моладзь, танцуючы кожную суботу, адбівала на столі першага апошнюю ўнікальную ляпніну. На падлозе ў канторы засталіся фрагменты мазаікі XIX стагоддзя, у адным з пакояў стаяла грубка, кафля на якой — празрыста-белая з пранізліва-сінім — нячутна напявала ўсё тую ж мелодыю паланэза. За палацам, як і задумалі калісьці яго гаспадары графы Умястоўскія, раскінулася правільнай формы сажалка, а ў парку ўгадваліся абрысы колішняй ліпавай алеі... Добра прыгледзеўшыся, можна было пераканацца: гэта сапраўды амаль дакладная копія «палаца на вадзе», пабудаванага для караля Панятоўскага (будынак і сёння вельмі ндрэнна пачувае сябе ў варшаўскім парку Лазенкі). А мясцовыя краязнаўцы яшчэ паказвалі выяву палаца ў Францыі — таксама адзін у адзін як у Жамыслаўлі, толькі дагледжаны, бела-ружовы, як напудраная паненка з пастаральнай эпохі.

А НАШ палац ужо шаснаццаць гадоў назад трэба было ратаваць ад заняпаду і канчатковага разбурэння. Тады, дзякуючы публікацыі ў «Звяздзе», яму фактычна вярнулі статус помніка архітэктуры, які ахоўваецца дзяржавай (да гэтага ахоўная дошка, казалі, была, але бясследна знікла). З цягам часу і кантора, і клуб адтуль пераехалі, і ўжо дзевяць гадоў будынак станавіўся «героем» рубрыкі «Страчаная спадчына» ў сецыве. Зразумела было, што палацу, каб выжыць і зажыць новым жыццём, патрэбен гаспадар...

Знайсці яго аказалася не так проста: з мая сядзібу Умястоўскіх у Жамыслаўлі выстаўлялі на аўкцыён пяць разоў. Цікавіліся ёй і расіянін, і беларусы. Але не купілі. Можа, чакалі, пакуль знізіцца цана, можа, баяліся брацца за адказную справу: па ўмовах падобных аўкцыёнаў, аднаўляючы гістарычны будынак, нельга парушаць яго першапачатковую архітэктуру, і размяшчацца ў ім павінен турыстычна-культурны аб'ект.

І вось нарэшце ў лістападзе пакупнік знайшоўся. Грамадзянін далёкай Іарданіі пачуў пра сядзібу ў Жамыслаўлі ад свайго беларускага знаёмага. І зацікавіўся, ды так, што прыехаў у Іўеўскі раён, пагледзеў на сядзібу і вырашыў яе купіць. За даволі вялікія (прынамсі для нас) грошы — больш чым за мільярд рублёў. Арабскі бізнесмен выказаў намер аднавіць гісторыка-культурныя аб'екты сядзібы ў першапачатковым выглядзе і адкрыць тут гатэль і рэстаран.

КАРАЦЕЙ, палацу пашанцавала. Ведаючы абавязковасць і сур'ёзнасць усходніх людзей, калі размова ідзе пра ўкладанне іх уласнага капіталу, можна смела казаць пра тое, што праз пару гадоў мы сапраўды зможам любавацца аднonline будынкам і параўноўваць яго з выявай на гравюры Напалеона Орды. І турысты будуць прыязджаць сюды абавязкова — не толькі з Беларусі, але і з Літвы, і з Польшчы: да мяжы і з першай, і з другой адсюль, можна сказаць, рукой падаць. І будуць для іх зручнасці ў старых аднолькавых сценах і гатэль, і рэстаран...

Але мне здаецца, ёсць у гэтай бочцы мёду кропля прыкрасці і дэсертная лыжачка сумнення. Прыкра за суайчыннікаў. Ёсць жа сярод нас сапраўды багатыя людзі са значным капіталам, якія павінен працаваць. Няўжо не знайшлося нікога, хто б гэты самы капітал (дакладней, невялікую частку) гатовы быў укласці не ў сучасную нерухомасць у цэнтры сталіцы ці за мяжой, а ў аднаўленне спадчыны? Зрабіць дабро і для сябе (бо, калі справу паставіць з розумам, дык і прыбытак будзеш мець), і для сваёй зямлі, для краіны, у якой жывеш, пакінуць пра сябе добрую памяць. Так вядзецца ў нас спрадвеку, і не за багацце і знатнасць хвалі ў крыптах храмаў графаў і князёў, а за тое, што яны гэтыя храмы будавалі...

А СУМНЕННЕ вось у чым. Уладальнікам палаца стаў чалавек, які мае добрыя намеры адносна нашай культуры і спадчыны, але не мае асабістага да іх дачынення. Так што ў выкананні яго планаў па вяртанні гістарычнага антуражу яму будуць дапамагаць нашы спецыялісты. А калі паміж іх акажуцца настырныя, выбачайце, дурні без густу, але з жаданнем зарабіць грошы? Што тады будзем мець? Аляпаватую пародыю з элементамі гратэску? І не паланэзам будуць адгукацца старыя сцены, а какафоніяй жалейкі і рэбаба?..

Вельмі хочацца верыць, што сумненні сумненнямі і застануцца. Ёсць жа краязнаўцы, ёсць гісторыкі, ёсць мясцовая ўлада. Нікому не павінна быць усё роўна.

Бо мы не так многа маем, каб быць абыякавымі...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■

# ЯК ДАМОВІЦЦА З НАТХНЕННЕМ

## Творчымі сакрэтамі падзяліўся Генадзь Давыдзька, які нядаўна выдаў дзіцячую кніжку

**Што лепшае — тэлевізар ці кніга? Ці пішаце вы на беларускай мове? Ці думае пісьменнік пра тое, як яго твор будзе ўспрымаць чытач? Для каго вам больш цікава пісаць — для дарослых ці для дзяцей? І ўвогуле, для чаго мы жывём на белым свеце?**
**У гомельскай студыі тэлеканала «Беларусь 4» адказы на гэтыя і іншыя пытанні шукалі ўдзельнікі творчай сустрэчы з заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь, старшынёй Белтэлерадыёкампаніі, тэлевядучым і літаратарам Генадзем Давыдзькам. Сустрэча праходзіла з улікам жанравых тэлевізійных асаблівасцей і абмежаванняў, але ж шчырасці размовы гэта зусім не замінала.**
**Дарэчы, была падстава, каб засяродзіцца менавіта на літаратурнай дзейнасці вядомай медыйнай асобы. Толькі што выйшлі з друку кніжкі «Лоўля слоў» і дзіцячая «Зоркі сёмага неба». Вашай увазе — сціслая версія разважанняў, агучаных падчас сустрэчы Генадзем Браніслававічам.**



### ПРА МЕСЦА ЛІТАРАТУРЫ Ў ЖЫЦЦІ

— Маё дзяцінства праходзіла ў вельмі маленькім пасёлку Сянно на Віцебшчыне. У той час тэлевізар меўся далёка не ва ўсіх дамах. Было адчуванне, што жыццё праходзіць дзесьці не тут, дзе я знаходжуся. Здавалася, што толькі літаратура можа выратаваць. Тады я прыйшоў у бібліятэку і стаў браць усё, што стаяла на паліцы, пачынаючы з літары «А». У 10 класе дайшоў да «С». Спыніўся на Сервантэсе. Таму Шэкспіра і Чэхава чытаў ужо ў інстытуце. Мне чытанне вельмі падабалася. Бессістэмнае, яно таксама карыснае, хоць пры гэтым адбываецца пэўная блытаніна, такі мікс жыцця і літаратуры. Потым гэтае адчуванне праходзіць.

### ПРА ЭМОЦЫІ І ІНФАРМАЦЫЮ

— Таму што жыццё больш цікавае, чым літаратура. А цікавейшае яно за кошт сённяшніх інфармацыйных магчымасцей. Раней у жыцці звычайнага чалавека было таксама цікавае: каханне, сяброўства, здрада, інтрыгі... Але ж літаратура дабаўляла такому жыццю аб'ём і эмоцыі. Сёння ж любы выпуск інфармацыйных навін цікавейшы, чым мастацкае кіно. Нават не вельмі эмацыйную падзею можна падаць у інтэрпрэтацыі СМІ вельмі эмацыйна. Магчыма, з гэтай прычыны людзі менш чытаюць. Аднак самы важны вызваленчы інструмент для кожнага чалавека — гэта тэлевізійны пульт. Трэба ім карыстацца і вызваляць сябе ад непатрэбнага прагляду перадач. Для гэтага ёсць тэлепраграма, дзе можна алоўкам абвесці тое, што трэба паглядзець абавязкова, а што — пажадана. І ўсё. Гэта бяда, калі людзі прыходзяць дадому і адразу ж уключаюць тэлевізар — праз яго ў віртуальныя госці можа зайсці хто заўгодна. Трэба выбарачна глядзець толькі тое, што падабаецца, і тое, што карысна.

### ПРА ПАПЕРУ І ПЛАНШЭТ

— Я ўпэўнены, што чалавек, які чытае тэкст менавіта з кнігі, а не з камп'ютара ці планшэта, даб'ецца ў жыцці большага, чым той, хто яе не чытае. Нават успрыманне літар на электронным носьбіце іншае, чым на папяровым. А што тычыцца прагляду кінаверсій кніг — у такім выпадку чалавек пазбаўляе сябе фантазіі. Ён бачыць вобразы вачамі рэжысёра карціны. І таму герояў твораў ён уяўляе толькі такімі, якімі іх іграюць акцёры. Такім чынам мы пазбаўляем сябе таямніцы любові да герояў арыгінальнага твора, стварэння іх вобразаў у сваёй галаве. Калі чалавек бярэ ў рукі кнігу, ён пагружаецца ў свой патаемны свет, космас, які нікому іншаму не даступны. І гэты працэс павінен быць у радасць.

### ПРА ХВАЛЯВАННЕ І МУЖНАСЦЬ

— На працягу многіх гадоў мае апаведы і вершы друкаваліся ў літаратурных часопісах і газетах. Я публічны чалавек і прывык месца сустрэч з многімі людзьмі. Але ж калі ты дзелішся не думкамі пра палітычную ці эканамічную сітуацыю, а тым, пра што разважаў на працягу гадоў, зусім патаемным... Пра тое, аб чым думаў па начах, калі было дрэнна ці ў моманты шчасця... Ведаеце, падзяліцца гэтым — трэба мець мужнасць. Гэта ж ствараласе не дзеля забавы. Таму сапраўды хвалявала: а ці патрэбна тое, што я кажу, тым, хто сабраўся на прэзентацыю?

**Мне страшна, што дзеці сёння гуляюць у тэрарыстаў. Я не хачу, каб гэта было іх звычайнай забаўкай. Мне хацелася б, каб прыкладамі для дзяцей былі не монстры з амерыканскіх мульцікаў, а тыя, хто спачувае жывёле і сябру.**

### ПРА НАЗВУ «ЛОЎЛЯ СЛОЎ» І ПАДАРУНАК ДА ЮБІЛЕЮ

— У кожнага свая калекцыя. Нехта збірае этыкеткі, хтосьці — манеты. Я словы збіраю, лаўлю іх паўсюль. Вельмі важна злавіць патрэбнае слова, цікавае словазлучэнне, калі хочаш зафіксаваць сваю думку на паперы. Да таго ж, згадзіцеся, «Лоўля слоў» — прыгожае словазлучэнне. Увогуле, гэты зборнік не я рабіў. Кніга створана маімі сябрамі Інэсай Собалевай і Сяргеем Дабудзькам. Яны сабралі мае тэксты і падарылі мне тыраж кнігі на дзень нараджэння. Магчыма, частку я і не друкаваў бы, але ж, можа, таму кніга і атрымалася такой жывой, хоць і не вельмі стройнай. Заўсёды можна нешта перафарматаваць, прыбраць, дабавіць... Але ж яна такая ўнікальная атрымалася, такі своеасаблівы сімвал сяброўства.

### ПРА ЗМЕСТ КНІГІ

— Пра каханне там практычна нічога няма. У кніжцы няма дат, калі былі напісаны творы. Здаецца, гэта не мае значэння. Пра што кніга? Напэўна, пра мары аб удасканаленні свету, чысціні адносінаў, шчырасці... Сябе трэба настроіць як музычны інструмент, які адгукаецца на крананні жыцця... Жыццё нас па-рознаму кранае. Менавіта таму і гучыш ты часам не вельмі цэнзурна, а трэба — адэкватна. Гук чалавечых слоў і чалавечага жыцця павінен быць пачуты. Ён павінен быць гарманічным. Да гэтага трэба імкнуцца. Напэўна, пра гэта і кніга.

### ПРА МОВЫ І ФАРБЫ

— Пэўны час я жыў у Расіі, і калі зноў вярнуўся ў Беларусь, каб удасканаліць веданне мовы, пачаў пісаць вершы па-беларуску. Я нават друкаваўся ў часопісах «Маладосць», «Крыніца», у газеце «ЛіМ»... А потым зразумеў, што ўсё ж пісаць мне лягчэй на рускай мове. Не тое, што на беларускай цяжка, але ж фарбы не тыя. Я вельмі люблю беларускіх пісьменнікаў — чытаю амаль усё, што выходзіць. Дарэчы, «Размаўляем па-беларуску» — выдатная праграма, якую робіць гомельскае тэлебачанне. Яна карыстаецца папулярнасцю ў гледачоў. Сёння ў маладых людзей ёсць цікавасць да мовы. Мне гэта важна і прыемна. Але ж я не бачу сваёй уласнай перспектывы як беларускамоўны пісьменнік. Да таго ж, хацелася б, каб мае творы пачыталі расійскія сябры.

### ПРА СТАСУНКІ І СЭНСЫ

— Вядома, кожнаму, хто піша, вельмі важна, як яго твор успрыме чытач. Важна, каб увогуле прачытаў. Бо часта чалавеку патрэбна не сама кніжка, а праз яе — пацверджанне нейкіх стасункаў з табой. Хочацца спытаць: а ці адкрываў ты гэтую кніжку, ці зразумеў, што я ёю хацеў сказаць? Таму для любога чалавека, які піша ці малюе, вельмі важна, каб зразумелі, што ён хоча сказаць свету.

### ПРА ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ

— Я пісаў казкі-п'есы для дзіцячага тэатра «Гоша», тры з якіх былі пастаўлены. Мне цікава пісаць для маленькіх людзей — ёсць магчымасць парадаксальна паглядзець на нейкія рэчы, з якімі ўсе звыкліся. Калі ўзяць дзіцячую кніжку «Зоркі сёмага неба» — яна напісана таксама і для дарослых. Я сказаў бы, яна для сямейнага чытання па ролях. Дарэчы, мудрасць дасягаецца за кошт страты дзяцінства. Калі шанцуе не згубіць дзіцячага погляду на свет, пры гэтым набыўшы мудрасць, — гэта вялікае шчасце.

### ПРА ЗОРКІ НА СЦЭНЕ І НА НЯБЁСАХ

— Мяне стала раздражняць, што наступіў час ілжы, падмены каштоўнасцяў. На пытанне «што такое зоркі?» многія адкажуць, што гэта артысты эстрады, якія спяваюць на сцэне. Гэта жудасна. Гэта і ёсць падмена паняццяў. Калі важна слава, здавацца, а быць — не важна. Раней казалі: па адзенні сустракаюць, а праводзяць па розуме. Цяпер і сустракаюць, і праводзяць па адзенні і кашальку. Мне здалося, што я магу быць адвакатам зорак на нябёсах, і я вырашыў адстаяць іх добрае імя. Дарэчы, цяпер на кінастудыі «Беларусьфільм» па казцы «Зоркі сёмага неба» запусцілі вытворчасць поўнаметражнага шасцісерыйнага фільма. Кожная серыя — па 13 хвілін.

### ПРА МОНСТРАЎ І ДЗІЦЯЧЫЯ ЗАБАЎКІ

— Аднойчы ля дзіцячага садка я пабачыў гару парваных кніжак. Іх засыпала снегам і па іх хадзілі вароны. Адначасова вакол садка хлопчыкі ганяліся за катом і кідалі ў яго палкамі. Пры гэтым выхавальніца вяла размову з маладым чалавекам — ёй было не да дзяцей. І мне здалося, што трэба нешта рабіць супраць усяго гэтага. Мне страшна, што дзеці сёння гуляюць у тэрарыстаў. Я не хачу, каб гэта было іх звычайнай забаўкай. Мне хацелася б, каб прыкладамі для дзяцей былі не монстры з амерыканскіх мульцікаў, а тыя, хто спачувае жывёле і сябру. І каб гэта не лічылася геройствам, а было звычайным праяўленнем чалавечнасці. Гледачам і чытачам я жадаю заўсёды толькі аднаго: радасці ад жыцця. Кожны павінен жыць дзеля задавальнення, якія ён прыносіць іншым, а калі і сам атрымлівае ад гэтага задавальненне — ён найшчаслівейшы чалавек.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by



## АЎТОРАК, 24 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Шчасліўчык Пашка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Зроблена ў СССР».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.50 Баявік «Залаты капкан».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05** «Арол і рэшка». Трэвэл-шоу.
**10.05** Капейка ў капейку.
**10.40, 16.20 Трылер «Закрытая школа».**
**11.45 Серыял «Косці».**
**12.35** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.35, 18.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.50 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**19.45, 22.10** Час футбола.
**19.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Пяты тур. БАТЭ — «Баер».
**22.00** Спортлато 6 з 49. КЕНА.
**22.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Пяты тур. «Барселона» — «Рома».
**0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд гульнявога дня.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.40** «Сусветная карцінная галерэя».
**7.55, 14.00, 18.45, 1.00** «Калейдаскоп».
**8.10 «Завяшчанне прафесара Доўэля». Фантастыка.**
**9.40** «Любімыя ВІА». Канцэрт з удзелам папулярных ВІА 1970-х, 80-х гадоў.
**10.40 «Банкавы білет у мільён фунтаў стэрлінгаў». Камедыя.**
**12.10, 0.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці графіка Сямёна Геруса.
**12.35 «Таму што кахаю». Кінааповесць.**
**14.15 «Нізамі». Кінараман. 1-я і 2-я серыі.**
**16.25** «Гітара па крузе». Віктар Фёдараў-Вішнякоў, акцёр, заслужаны артыст Расіі, скрыпачка Тацяна Хазанава.
**17.20 «Паветраплавальнік». Маст. фільм.**
**19.05, 21.30 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Дэтэктыў. 1—2-я серыя.**
**20.10, 22.35** «Дыя@блог». «Пра мову».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Выпрабаванне». Фільм першы «Крэпасць». Дак. фільм.
**23.00 «Маці Урагану». Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.05** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 58 кг.
**8.50** PRO спорт. Вынікі.
**9.15, 16.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 69 кг.
**10.55** Баскетбол. Еўракваліфікацыя да ЧЕ-2017. Жанчыны. Польшча — Беларусь.
**12.30** Гандбол. SEHA-ліга. «БГК імя Мяшкова» (Беларусь) — «Татран» (Славакія).
**13.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**14.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крystal Пэлас» — «Сандэрлэнд».
**18.25** Спорт-кадр.
**18.50, 23.40** PRO спорт. Навіны.
**18.55** Баскетбол. Кубак ФІБА. «Цмокі-Мінск» — «Рыльскі Спортыст».
**20.55** Авертайм.
**21.25** Хакей. КХЛ. «Слован» — «Дынама-Мінск».
**23.50** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Вялікая».**
**22.50 Маст. фільм «З жанчыны».**
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Спатканне маёй мары».**
**10.20** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Наша справа».
**14.05** «Мае цудоўныя...»
**15.00, 23.40 «Халасцякі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.35** «Дакументальны праект»: «Паляванне на экстрасэнсаў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.10** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.05** «На тым жа месцы ў той жа час».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30, 1.00 Маст. фільм «Мама выйшла замуж».**
**11.10 Маст. фільм «Індыга».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 19.25 Серыял «Развод».**
**15.05** «Справы сямейныя».
**16.20, 4.20** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50, 4.45** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Амазонкі».**
**21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**22.05 Маст. фільм «Абмяняйцеся пярсцёнкамі».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.05** Ток-шоу «Слова за словам».
**2.35 Серыял «Шчасце ты маё».**
**5.10** Дак. фільм «З нагоды».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.25** «Расія без тэрору. Завербаваныя смерцю». «Следчы эксперымент. Нямыя сведкі».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
**19.00** «Наш чалавек».
**20.55 Серыял «Земскі доктар».**
**21.55, 23.10 Серыял «Ганка з Малдаванкі».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05 Серыял «Адвакат».**
**7.10** «Новыя рускія сенсацыі».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Справа густу».
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20 Серыял «Ліцейны».**
**17.55** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Чужы».**
**21.25 Серыял «Пятніцкі. Глава чацвёртая».**
**23.10** «Анатомія дня».
**23.50 Серыял «Шаман».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.30, 18.20 Серыял «Дэманы да Вінчы».**
**9.35, 12.55, 13.50, 15.45, 16.30, 18.15, 19.25, 21.00** «Хатняя крама».
**9.45** Дакументальны экран «Вострaў канібалаў».
**10.10** «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**11.10 Трылер «Нешта».**
**12.45, 16.20** «Кінаблакнот».
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Лавіна».**
**16.40 Серыял «Выкрадзення».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Меладрама «Жыццё, як яно ёсць».**
**23.20 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 16.00** «Турбаміксер».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Святлафор 5».
**10.00, 14.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**11.00, 15.00, 19.00** Серыял «Лондангpад».
**12.00** Меладрама «Выпрабавальны тэрмін».
**17.00** «Ералаш».
**17.30, 0.00** «Уральскія пельмені».
**21.10** Камедыя «Таткі 2».
**23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».
**4.00** «Лаві момант».
**5.00** «Рублёва — Бірулёва».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15** «Кінастудыя імя М. Горкага. Пачатак». «Маці». Маст. фільм.
**12.50** «Хор Жарава». Дак. фільм.
**13.15** «Пятае вымярэнне».
**13.40** «Лапікавы тэатр». Дак. фільм.
**13.50** «Нікала Паганіні». Маст. фільм.
**15.10, 20.45** «Жывое слова».
**15.50** «Чаму жанчыны ростам ніжэйшыя за мужчын?» Дак. фільм.
**16.45** Да 110-годдзя з дня нараджэння Ангеліны Сцяпанавай. «Сёння — мой дзень». Дак. фільм.
**17.25** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.45** Да юбілею ДСА Рэспублікі Татарстан. С. Рахманінаў. Сімфонія №1. А. Чайкоўскі. «Стан Тамерлана».
**18.45** «Кнігі майго лёсу».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.25** «Гульня ў бісер». «Канстанцін Сіманаў. Лірыка».
**22.05** «Фрэнсіс Бэкан». Дак. фільм.
**22.15** Навука без межаў. «Чалавечы маштаб. Жыццё ў вялікім горадзе». Дак. фільм.
**23.10** «Тыя, з якімі я...» «Леанід Філатаў».
**23.55** Мастсавет.
**0.00** «Лявічка». Маст. фільм.
**1.35** Рэно Гарсія-Фонс. Канцэрт у Марсэволі.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Анатоль Крупноў. 1997 год.
**6.40, 8.05, 9.25, 11.30, 13.00, 15.40, 17.00, 19.00, 20.20, 21.40, 23.00, 1.00, 2.20, 5.15** Музычная настальгія.
**7.10** «Барыс Грабеншчыкоў і яго група «Аквариум». 1990 год.
**8.30** Дак. фільм «Францыя, песня...».
**10.00** Маст. фільм «Горад з раніцы да паўночы».
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Радыё 1970—1980 гг.». Віктар Татарскі, Дзіяна Берлін. 2005 год.
**13.10** Маст. фільм «Памылка Анарэ дэ Бальзака».
**14.45, 20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Наталля Дудкіна. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Водпуск, які не адбыўся».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1987. 2-я частка.
**1.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...». Андрэй Міронаў.
**3.00** «Быў час». 2008 год.
**4.00** Маст. фільм «Цягнік па-за раскладам».

### EUROSPORT

**5.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**6.00, 9.45, 15.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**6.45, 10.30, 12.30, 15.45, 1.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**7.45, 11.30, 19.00, 0.00, 4.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**14.00, 14.55, 20.15, 21.10** Футбол. Еўрагалы.
**14.05, 20.20** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**14.30, 20.45** Футбол. Веліч футбола.
**16.30** «Час скачак».
**16.45** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**21.15** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**0.25** «Вялікія гонкі».
**0.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету па гонках на цягавітасць.
**1.00** Акадэмія GT. Аўтаспорт.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.50, 22.00, 3.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.25** Камедыя «Вучань Дзюкабю».
**8.00** Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
**10.35** Камедыя «Улётны рэйс».



**12.20** Меладрама «Іронія кахання».
**14.00, 14.50, 15.40, 0.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».
**16.00** Камедыя «Два светы».
**18.40** Камедыя «Штосьці падобнае на шчасце».
**20.20** Камедыя «Снежная нявеста».
**23.10** Камедыя «Блізня».
**1.20** Меладрама «Сама па сабе».
**4.00** Камедыя «Мамулі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45** «Доктар І...»
**8.15, 18.50, 1.15** «Гісторыя кахання». Серыял.
**10.00, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.35** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.30, 17.55** «Тайны следства». Серыял.
**14.25** «Простыя складанасці».
**14.55** «Prокіно».
**15.5. 2.55** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Мой герой».
**16.50, 21.50** «Шулер». Серыял.
**20.55, 0.30** «Берагі маёй мары». Серыял.
**22.50, 5.15** «Зорныя гісторыі».
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.50, 3.25** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».
**9.10** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**11.05** Камедыя «Мадлен».
**12.40** Фантастыка «Дывергент».
**15.00** Містыка «Знаёмцеся, Джо Блэк».
**18.00** Меладрама «Джэйн Эйр».
**20.00** Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».
**22.00** Камедыя «Дом Хэмінгуэй».
**23.40** Драма «Галгофа».
**1.25** Трагікамедыя «Пакуль не накрыўся вечкам».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Дыялогі».
**8.10** Драма «Ганна і камандор».
**9.40** Камедыя «Дэжа вю».
**11.40** Фантастыка «Форт Рос: у пошуках прыгод».
**13.30** Драма «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
**14.50** Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
**16.35** Прыгоды «Скарбы О.К.».
**18.30** Драма «Бедны, бедны Павел».
**20.20** Камедыя «Кахае — не кахае».
**22.10** Драма «Weekend».
**0.00** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**1.30** Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
**2.55, 4.35** Фантастыка «Паляўнічы».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 11.00** Мегазаводы.
**6.50** Займальная навука.
**7.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Прарыў.
**9.20, 13.30, 19.20** Непаражальныя канструкцыі.
**10.10, 14.20, 20.10** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.50** Ледзяная дарога.
**12.40** Цяжкае золата Аляскі.
**15.10** Дзікія жывёлы Поўначы.
**16.00** Тайвань: востраў рыбы.
**16.50** Гульні розуму.
**17.40, 21.50, 2.00, 5.15** Як перамагчы ва ўсім.
**18.30, 2.50** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 1.10, 4.30** Шырокі погляд.
**22.40, 3.40** НЛА над Еўропай.
**23.30** Праўда аб зомбі.
**0.20** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Хуткія і гучныя.
**8.50** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Бітвы за кантэйнеры.
**11.35, 7.10** Рыбацкія легенды.
**13.25, 6.25** Што было далей?
**15.15, 1.00, 5.35** Круты цюнінг.
**16.10, 23.00, 3.00** Махінатары.
**18.00** Голыя і напалоханыя.
**20.00** Дзікая кухня.
**22.00** Мяцежны гараж.
**0.00** Кубінскі хром.
**2.00, 4.50** Іржавая імперыя.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## Спяваем з Еўропай

# ДЗІЦЯЧАЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ» ЗАПРАШАЕ НА ФІНАЛ

**Адкрывайце новыя імёны і выбірайце найлепшую песню**

**У суботу, 21 лістапада, зноў збярэ каля экранаў гледачоў па ўсім свеце міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2015».**



Канкурсанты з 17 краін-удзельніц сабраліся ў Сафіі, сталіцы Балгарыі, каб дэманстраваць свае вакальныя таленты і змагацца за званне найлепшага. Беларускі ўдзельнік Руслан Асланаў ужо паспеў апрабаваць конкурсную пляцоўку, адчуць балгарскую гасцінnасць і прайсціся па чырвонай дарожцы падчас афіцыйнага адкрыцця еўратыдня.

Паміж рэпетыцыямі, фотасесіямі, інтэрв'ю арганізатарамі запланавана для канкурсантаў і культурная праграма. Напрыклад, дэлегацыі Беларусі, Арменіі, Албаніі і Мальты навучылі традыцыйным балгарскім рамёствам — майстар-класы ладзілі ў музеі, дзе паказалі, як валяць з шэрсці.

На цырымонію адкрыцця, якая сёлета прайшла ў Нацыянальным балгарскім палацы культуры, прыляцеў пераможца мінулага года Вінчэнца Канціела з Італіі. Сустрэць тут можна і іншых пачэсных гасцей «Еўрабачання» ва ўзросце да 16 гадоў. Прайсціся па чырвонай дарожцы — гэта асаблівы рытуал для канкурсантаў. Не проста даніна прыгожай традыцыі адкрыцця еўратыдня, а момант адметны — ушанаванне дэлегатаў з розных краін (а сёлета на конкурсе 17 краін-удзельніц). У складзе беларускай афіцыйнай дэлегацыі 10 чалавек: вакальны прадзюсар, урач-фаніятар, рэжысёр, стыліст. За падрыхтоўкай Руслана да конкурсу назірае ў тым ліку і здымачная каманда Агенцтва тэлевізійных навін. На сцэну арэны «Армеец» наш артыст выйдзе адзін, без балета і бэк-вакалу. У Сафію беларуская дэлегацыя прывезла эксклюзіўнае графічнае афармленне. Таму нумар Руслана Асланава інтэрактыўны ў прамым сэнсе — у глядзельную залу спявак будзе пасылаць святлодыёдных матылёў. Яны ж ёсць і ў кліпе канкурсанта. (Нагадаем, што яго падрыхтоўку здзяйсне Белтэлерадыёкампанія як адзіны ў краіне член Еўрапейскага вяшчальнага саюза.)

Убачыць выступленне юнага артыста мы зможам пад нумарам 10. Увогуле, парадак выступленняў удзельнікаў выглядае наступным чынам: 1. Сербія, 2. Грузія, 3. Славенія, 4. Італія, 5. Галандыя, 6. Аўстралія, 7. Ірландыя, 8. Расія, 9. Македонія, 10. Беларусь, 11. Арменія, 12. Украіна, 13. Балгарыя, 14. Сан-Марына, 15. Мальта, 16. Албанія, 17. Чарнагорыя.

Падчас грандыёзнага шоу ў зале размесціцца каля 8 000 гледачоў, а тэлеаўдыторыя традыцыйна будзе шматмільённай. У афармленні конкурснай сцэны мы ўбачым сімвал сёлетняга конкурсу — дзьмухавец, які будзе зроблены з розных святлодыёдных лямп. Пачуем гімн конкурсу — песню «Discover», што, дарэчы, дублюе слоган дзіцячага «Еўрабачання-2015», хэштэг #discover — #адкрывай. Гледачы змогуць глядзець шоу стоячы. Вядучай конкурсу выбрана Полі Генава, вядомая ў Еўропе як прадстаўніца Балгарыі на «Еўрабачанні-2011».

Для нас весці прамую трансляцыю дзіцячага «Еўрабачання-2015» будуць тэлеканалы «Беларусь 1» і спадарожнікавы «Беларусь 24». Каментаваць конкурс будзе спецыяльны карэспандэнт аддзела замежнай інфармацыі Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі Анатоль Ліпецкі.

**Алена ДРАПКО.** drapko@zviazda.by

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Самы спрыяльны тыдзень, у некаторых момантах нават залішне. Мноства радасных падзей наведаюць вас, найперш эмацыйных. Часам радасць будзе нават нічым не абумоўлена, але хіба патрэбны такому пачуццю нейкія доказы і передумовы. Можа праявіцца цяга да празмернасці ў ежы і, вядома ж, вясёлосці. Настрой гэта вам толькі ўзмоцніць, але ёсць небяспека пагаршэння самаадчування, перанасычэння і, як следства, эмацыйнага знясілення ў далейшым. Радуйцеся жыццю, але ведайце ва ўсім меру.



**СКАРПІЁН.** Усе дні будуць прысвечаны толькі пытанням фінансавага дабрабыту. Падобная накіраванасць можа прывесці да таго, што вы не будзеце заўважаць у жыцці нічога, акрамя працы, і ва ўсім бачыць толькі выгаду. Так можна стаць рабом матэрыяльнага свету. Самі грошы да вас не пойдуць, іх трэба зарабляць — і тут у вас будзе атрымлівацца як нельга лепш. А вось пра адпачынак і іншыя радасці жыцця, верагодна, давядзецца забыцца.



**СТРАЛЕЦ.** Упэўнены і спакойны тыдзень, які дазваляе адчуць у сабе новыя сілы і магчымасці для далейшага руху. Можаце разлічваць на падтрымку з боку сваякоў, калег і сяброў. Добры час для таго, каб ўзяцца за нешта новае. Будзеце поўныя ідэй, імкненняў і сіл для рэалізацыі задуманага, або, прынамсі, для здзяйснення першых крокаў. Крыху абачлівей і асцярожней варта быць бліжэй да канца тыдня, ёсць рызыка праявіць няўважлівасць.



**КАЗЯРОГ.** Не выключана актыўная грамадская дзейнасць. Варта чакаць вялікай колькасці кантактаў з людзьмі, узаемадзеяння з рознымі інстанцыямі. У гэты час добра працаваць з дакументамі, заключаць дамовы або пісаць службовыя лісты, бо і з вашага боку, і з процілеглага ўсе справы і развязанні працякаюць хутка і ў адпаведнасці з правіламі. Ад супрацьзаконных дзеянняў трэба ўстрымацца, бо ёсць рызыка быць злоўленым. Вялікая колькасць жыццёвых сіл дазволіць дамагчыся поспеху і на іншых напрамках.



**ВАДАЛЕЙ.** Вы не павінны адмаўляцца ад сваёй мары, ад імкнення да лепшага. І хоць на гэтым тыдні ўсе можа пайсці зусім не так, як запланавана, а некаторыя планы могуць разбурыцца, не варта адчайвацца. Пасля няўдач гэтага тыдня перад вамі адкрыюцца новыя магчымасці, новыя перспектывы, дзе вы зможаце сябе рэалізаваць. Калі не страціце веру ў сябе і жаданне рухацца далей, нягледзячы на знешнія абставіны, то абавязкова дасягняце таго, чаго жадаеце. А няроўнасці шляху робяць яго толькі цікавейшым.



**РЫБЫ.** Час спрыяльны для вoінаў па натуры, а таксама для падарожнікаў і ўсіх тых, хто прывык дамагацца выніку, спадзеючыся толькі на сябе і сваю рашучасць. Смела прасоўвайцеся наперад, і ніякія перашкоды не змогуць вас спыніць. Перад вамі адкрываюцца новыя магчымасці яшчэ не пройдзенага шляху, і ўсё, што застаецца зрабіць, — гэта толькі адправіцца ў гэтае падарожжа, невядомае, але захапляльнае. Спрыяльны час для фінансавых пачынанняў, адкрыцця сваёй справы або выгаднага ўкладання.

## ЧАЦВЕР, 26 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.30** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Шчасліўчык Пашка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Зроблена ў СССР». Заключная серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.40 Баявік «Залаты капкан».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.50** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 22.10** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**10.00** Капейка ў капейку.
**10.25, 16.20 Трылер «Закрытая школа».**
**11.40, 23.50 Серыял «Косці».**
**12.30, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.30, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**15.30, 23.05** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**0.35 Серыял «У эфіры».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.40** «Сусветная карцінная галерэя».
**7.55, 13.40, 18.00, 1.15** «Калейдаскоп».
**8.10, 19.05, 21.30 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Дэтэктыў.**
**10.30** «Выпрабаванне». Фільм другі «Ваенурач другога рангу». Дак. фільм.
**11.00 «Чорны замак Альшанскі». Дэтэктыў.**
**13.10** «Сівая легенда Уладзіміра Караткевіча». Дак. фільм.
**13.55, 18.15** «Размаўляем па-беларуску».
**14.00, 0.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Юрыя Семяняки.
**14.30 «Яраслаўна, каралева Францыі». Маст. фільм.**
**16.05** «Славянскі базар-2014». Надзея Кадышава і ансамбль «Золотое кольцо».
**17.30** «Сіла веры».
**18.25** «Неразгаданая таямніца». Навукова-папулярны фільм пра таямніцы мозгу.
**20.10, 22.35** «Дыя@блог». «Пра вечнае».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Выпрабаванне». Фільм трэці «Ідзі і змагайся». Дак. фільм.
**23.00 «Абарона Лужына». Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.35, 18.20, 22.55** PRO спорт. Навіны.
**7.45** Баскетбол. НБА. «Х'юстан» — «Мемфіс».
**9.40, 16.05** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 85 кг.
**10.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Ювентус» — «Манчэстэр Сіці».
**13.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд гульнявога дня.
**14.25** Баскетбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2017. Жанчыны. Беларусь — Бельгія.
**17.50** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**18.30** Час футбола.
**18.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Дынама-Мінск» (Беларусь) — «Вікторыя Пльзень» (Чэхія).
**21.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Лакаматыў» (Масква) — «Спортынг» (Лісабон).
**23.05** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 94 кг.
**0.35** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 69 кг.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Закаханыя жанчыны».**
**23.25 Маст. фільм «Прыгоды Форда Ферлейна».**
**1.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Чалавек з дажджом у чараўніках».**
**10.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Мае цудоўныя...»
**14.50, 23.40 «Халасцякі». Серыял. Заключная серыі.**
**16.50** «Ведай нашых!»
**18.35** «Дакументальны праект»: «Храмы багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Скрыжаванне».**

**22.10** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.10** «Тайны Чапман».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Чаму я?»
**9.30, 1.00 Маст. фільм «Цыганскае шчасце».**
**11.00 Маст. фільм «У палоне падману».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 19.25 Серыял «Развод».**
**15.05** «Справы сямейныя».
**16.20, 4.20** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50, 4.45** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Амазонкі».**
**21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**22.05 Маст. фільм «Два дні».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.05** Ток-шоу «Слова за словам».
**2.30 Серыял «Шчасце ты маё».**
**5.10** Дак. фільм «З нагоды».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «Гістарычныя хронікі» з Мікалаем Сванідзэ. «1993. Барыс Ельцын».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
**19.00** «Наш чалавек».
**20.55 Серыял «Земскі доктар».**
**21.55, 23.10 Серыял «Ганка з Малдаванкі».**
**23.50** «Паядынак».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05 Серыял «Адвакат».**
**7.10** «Цуд тэхнікі».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Справа густу».
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20 Серыял «Ліцейны».**
**17.55** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Чужы».**
**21.25 Серыял «Пятніцкі. Глава чацвёртая».**
**23.10** «Анатомія дня».
**23.50 Серыял «Шаман».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Дэманы да Вінчы».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.45** Дакументальны экран «Выходжу адзін я на дарогу».
**10.15** «Хобі+TV».
**10.45 Баявік «Памры, але не цяпер».**
**12.55, 13.50, 15.45, 16.30, 18.15, 21.00** «Хатняя крама».
**13.05 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Лавізна».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00 Камедыя «Доктар Дуліттл».**
**19.30** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Камедыя «Мой бацька — мой герой».**
**23.15 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 16.00** «Турбаміксер».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Святлафор 5».
**10.00, 14.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**11.00, 15.00, 19.00** Серыял «Лонданград».
**12.00** Камедыя «Вяртанне на востраў Нім».
**13.50, 17.00** «Ералаш».
**17.30, 0.00** «Уральскія пельмені».
**21.10** Камедыя «Агент 117: місія ў Рыа».
**23.05, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».
**4.00** «Лаві момант».
**5.00** «Рублёва — Бірулёва».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15** «Кінастудыя імя М. Горкага. Пачатак». «Ускраіна». Маст. фільм.
**13.00, 17.30** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.15** «Расія, любоў мая!» «Негідальцы. Людзі ракі».
**13.50** «Нікала Паганіні». Маст. фільм.
**15.10, 20.45** «Жывое слова».
**15.50, 22.15** «Нябачны Сусвет». Дак. фільм.
**16.45** «Больш, чым каханне». Павел Корын і Праскоўя Пятрова.
**17.45** Да юбілею ДСА Рэспублікі Татарстан. С. Рахманінаў. Сімфанічная паэма «Востраў мёртвых» і Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам № 1.
**18.45** «Кнігі майго лёсу».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.25** «Культурная рэвалюцыя».
**23.10** «Тыя, з якімі я...». «Станіслаў Гаварухін». Частка 2-я.
**23.55** Мастсавет.
**0.00** «Аўтамабіль». Маст. фільм.
**1.35** «Pro memoria». «Лютэцыя Дэмарэ».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Наталля Дудкіна. 2007 год.
**7.00, 8.20, 9.40, 11.00, 12.50, 14.30, 15.40, 17.00, 18.55, 20.30, 21.40, 23.00, 1.00, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Водпуск, які не адбыўся».
**8.45, 14.45, 20.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час...». «Грошы для новай Расіі». 2007 год.
**13.30** Маст. фільм «Мары насустрач».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Дзмітрый Грыгор'еў і Ірына Хрысціянава. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «На вастрыі мяча».
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Радыё 1970—1980 гг.». Віктар Татарскі, Дзіяна Берлін. 2005 год.
**1.10** Маст. фільм «Памылка Анарэ дэ Бальзака».

### EUROSPORT 1

**5.00, 7.30, 3.15** WATTS!
**6.00, 9.30, 14.00, 21.00, 23.45, 4.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**8.30, 15.30, 20.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Найлепшыя моманты.
**11.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**16.30** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**17.00** Футбол. Лаціна.
**17.30** Футбол. ФІФА.
**17.55** Футбол. Еўрагалы.
**18.00, 3.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Мужчыны.
**2.15** Strongest man. Ліга чэмпіёнаў.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.50, 22.00, 3.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.25** Меладрама «Іронія кахання».
**8.00** Камедыя «Штосьці падобнае на шчасце».
**10.35** Камедыя «Блізня».
**12.20** Камедыя «Снежная нявеста».
**14.00, 14.50, 15.40, 0.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».
**16.00** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
**18.45** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**20.20** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
**23.10** Камедыя «Выкрутасы».
**1.15** Камедыя «Два светы».
**4.00** Камедыя «Улётны рэйс».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 18.55, 1.40** «Гісторыя кахання». Серыял.
**10.05, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.55, 4.45** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.50** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.45** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.40, 17.55** «Тайны следства». Серыял.
**14.35, 5.35** «Простыя складанасці».
**15.5. 3.15** «Нераскрытыя тайны».
**16.05** «Мой герой».
**16.55, 21.50** «Шулер». Серыял.
**20.50, 0.55** «Берагі маёй мары». Серыял.
**22.55, 5.15** «Зорныя госці».
**23.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**0.45** «Рокіно».

### ТБ1000

**5.50** Драма «Маленькія жанчыны».
**8.00, 16.10** Меладрама «Розум і пачуцці».
**10.25** Трылер «Урачысты фінал».
**12.00** Камедыя «Закаханы Шэкспір».
**14.10** Драма «Рамэа і Джульета».
**18.30** Драма «Разня».
**20.00** Драма «Галгофа».



**21.40** Драма «Добрай ночы, Месяц».
**23.10** Камедыя «Дом Хэмінгуэй».
**0.45** Драма «8 міля».
**2.35** Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
**4.50** Меладрама «Каханне з перашкодамі».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Масква».
**8.50** Драма «Балі Валтасара, ці Ноч са Сталіным».
**10.30** Меладрама «Вечнае вяртанне».
**12.30, 13.45, 15.05** Прыгоды «Вязень замка Іф».
**16.50** Драма «Weekend».
**18.30** Баявік «Шлях».
**20.20** Трылер «Уцекачы».
**22.10** Драма «Брэсцкая крэпасць».
**0.35** Дэтэктыў «Дачка».
**2.40** Меладрама «Начныя забавы».
**4.40** Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 11.00** Мегазаводы.
**6.50** Займальная навука.
**7.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Шырокі погляд.
**8.30** Як перамагчы ва ўсім.
**9.20, 13.30, 19.20** Незвычайныя здабычы.
**10.10, 14.20, 20.10** Ледзяная дарога.
**12.40** Цяжкае золата Аляскі.
**15.10** Дзікія жывёлы Поўначы.
**16.00** Тайвань: востраў рыбы.
**16.50, 21.00, 1.10, 4.30** Золата Юкана.
**17.40** Дзікі тунец.
**18.30, 2.50** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**21.50, 2.00, 5.15** Золата ў халоднай вадзе.
**22.40, 3.40** Уварванне на Зямлю.
**23.30** Паранармальнае.
**0.20** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Дарога да прыбытку.
**8.50** Глядзі ва ўсе вочы.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Склады.
**11.35, 1.00, 7.10** Голыя і напалоханыя.
**13.25, 6.25** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**15.15, 5.35** Поўны фарсаж.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Гаражнае золата.
**19.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**20.00** Стальныя хлопцы.
**22.00** Хлопцы з Юкана.
**23.00** Смяротны ўлоў.
**0.00** Мяцежнікі ледзянога возера.
**2.00, 4.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## СУБОТА, 28 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.50** Існасць.
**7.15 Меладрама «Не адпускай мяне». 1-я серыя.**
**8.50** Слова Мітрапаліта Паўла на пачатак Калляднага посту.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Буйным планам.
**9.40** Трансфармацыя.
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**10.55** Выхад ёсць.
**11.25** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**12.55** Нашы.
**13.10, 15.45 Меладрама «Зімовы вальс».**
**15.15** Краіна.
**17.30 Меладрама «Даша».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Не адпускай мяне».**
**0.55** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05, 11.05** М/с «Сябры анёлаў».
**8.05** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**8.35 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.10** Азбука густу.
**10.45** М/с «Прыгоды Дзіна».
**12.05 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**14.00** Капейка ў капейку.
**14.40** «Арол і рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
**15.40 Прыгоды «Гаспадар мораў: на краі Зямлі».**
**18.00** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**19.50** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10 Меладрама «Іншаземка».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**23.20** «Арол і рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**0.15 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.55, 13.35, 18.45, 0.30** «Калейдаскоп».
**8.10, 18.55, 21.15 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Дэтэктыў.**
**10.35** «Выпрабаванне». Фільм чацвёрты «Плошча рабоў — тэрыторыя барацьбы». Дак. фільм.
**11.05 «Бацька». Кінааповесць.**
**12.35** «Партызаны». Бацька Мінай.
**13.05** «Памяці кампазітара Нестара Сакалоўскага».
**13.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**14.20 «Бывай, Гульсары!» Драма.**
**16.00** «Камертон». Заслужаны дзеяч Казахстана, акцёр, прадзюсар Армэн Асенаў.
**16.30 «Забытая мелодыя для флейты». Меладрама.**
**20.00** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Джэймс Бонд. Таямніца агента 007». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Дазвольце расказаць!» Амерыканскі гітарыст Стэнлі Джордан.
**22.20 «Выратуйце «Канкорд». Драма.**
**23.55** «Бард-парад».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.20, 23.35** PRO спорт. Навіны.
**7.35** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 75 кг.
**9.20** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 105 кг.
**11.05** Баскетбол. НБА. «Індыяна» — «Чыкага».
**12.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Другі этап.
**15.10** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**15.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**16.30, 19.10** Авертайм. КХЛ.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Адмірал».
**19.20** Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**19.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Лагроньа» (Іспанія) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**23.35** Еўрапейскі покерны тур.
**0.25** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Звыш 105 кг.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** Рэаліці-шоу «Аўтобус».
**13.35 Кіно ў колеры. Маст. фільм «Прыходзьце заўтра...».**
**15.15** «Следства пакажа».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**17.20 Драма «Слон».**
**18.50** «ДОстояние РЕспублики: Яўген Крылатаў».
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35 Маст. фільм «Жыццё горшае за звычайнае».**
**0.30 Камедыя «Бывай, каханне».**

### СТБ

**6.05** 1/2 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ.
**7.55** «Анфас».
**8.10** «Тайны Чапман».
**9.05** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**10.00** «Іншая краіна». «Дзіўная Паўднёвая Афрыка, або Бусел насарогу — таварыш!?»
**11.20** «Мінск і мінчане».
**11.55 «Салдаты 6». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.45 Маст. фільм «Рыцар без даспехаў».**
**15.35** «Вадзіць па-руску».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.40 Маст. фільм «Ходзяць чуткі...».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Трылер «Абсалютная ўлада».**
**22.20** «Дакументальны праект»: «Вялікія тайны старажытнасці».

### МІР

**6.00, 8.40, 13.50** М/ф.
**6.30 Маст. фільм «Зімовы вечар у Гаграх».**
**8.10** «Саюзнікі».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30, 5.10** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Пра бедная гусара замоўце слова».**
**13.50 Маст. фільм «Фанфан-цюльпан».**
**16.15 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**18.25 Маст. фільм «Кахаць па-руску».**
**20.05 Маст. фільм «Кахаць па-руску 2».**
**21.50 Маст. фільм «Кахаць па-руску 3».**
**23.40** «Культпрасвет».
**0.25** «Дыяспары».
**0.55 Маст. фільм «Жанчына і мужчыны».**
**2.55** Дак. фільм «З нагоды».
**3.50 Маст. фільм «Антон Іванавіч сярдуе».**
**5.40** М/ф.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.30 Маст. фільм «Сцяжынка ўздоўж ракі».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.10** «Асабістае. Эліна Быстрыцкая».
**12.40 Маст. фільм «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка».**
**14.15** «Дзве жонкі».
**15.15 Маст. фільм «Я цябе ніколі не забуду».**
**17.10 Маст. фільм «Ахоўвай яе, каханне».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Галоўная сцэна».
**23.10 Маст. фільм «Пад знакам Месяца».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худзею!»
**14.20** «Ежа жывая і мёртвая».
«Суперпрадукты».
**15.10, 16.20 Серыял «Час Волкава».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.55** «Ты не паверыш!»
**21.50** «50 адценняў. Бялова».
**22.50** «Час Г».
**23.30 Маст. фільм «Другое каханне».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 15.25, 19.10, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.30 Серыял «Дэманы да Вінчы».**
**10.30, 11.00, 15.55, 17.30** «Хатняя крама».
**10.45** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.15 Драма «Блукаючыя зоркі».**
**13.35 Прыгоды «Вялікія манеўры».**
**15.30** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.40 Трылер «Аварыя».**
**19.15 Трылер «Ва-банк».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Трылер «Скарбы нацыі».**

### ВТБ

**6.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.00, 4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 13.50** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Меладрама «Вельмі небяспечная штучка».
**14.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Вялікая маленькая зорка».
**15.30** Кулінарнае шоу «Майстаршэф. Дзеці».
**16.30** «Уральскія пельмені».
**18.00** Серыял «Кухня 5».
**20.30** Камедыя «Даспехі Бога 3: місія Задыяк».
**23.30** «Дзікія гульні».
**0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**3.30** «Лаві момант».
**5.00** Серыял «Свацці».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** Кінастудыі імя М. Горкага — 100! «Канёк-гарбунок». Маст. фільм.
**11.55** «Ціхі Дон». Здымкі на фоне эпохі». Дак. фільм.
**12.35** Пернікавы домік. «Пераплётная справа».
**13.00** «Ключы ад аркестра з Жанам-Франсуа Зіжэлем». Ігар Стравінскі. «Жар-птушка».
**14.35** «Магістраль». Маст. фільм.
**16.05** Да юбілею актрысы. «Больш, чым каханне». Ніна Грабяшкова і Леанід Гайдай.
**16.45, 2.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** 100 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Сіманава. «Ка. Эм.». Дак. фільм. Частка 1-я.
**18.25** Выдатныя пісьменнікі Расіі. Канстанцін Сіманаў. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна». Запіс 1977 года.
**20.05** «Канстанцін Сіманаў. Жорсткі зрок». Дак. фільм.
**20.55** «Рамантыка рамана». Сяргей Захараў.
**21.55** «Белая студыя».
**22.35** Кіно на ўсе часы. «Дзік Трэйсі». Маст. фільм.
**0.25** «Дзікая Паўднёвая Афрыка. «Вялікая пяцёрка». Дак. фільм.
**1.10** Сэр Сайман Рэтл і Берлінскі філарманічны аркестр. Канцэрт у Берліне.
**1.55** «Шукальнікі». «Загадка «падмаскоўнага Версаля».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Сняем, сябры!» з Таццяна Візбар. Дзмітрый Грыгор'еў і Ірына Хрысціянава. 2007 год.
**7.00, 8.30, 9.40, 11.00, 13.00, 15.40, 17.00, 18.55, 20.20, 23.15, 0.50, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «На вастрыі мяча».
**8.45, 14.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1988.
**13.20** Дак. фільм «Мора нашай надзеі».
**16.00** «Колба часу».
**19.30** Дак. фільм «Старыя майстры».
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Маст. фільм «Між высокіх хлябоў».
**0.00** «Быў час...». «Грошы для новай Расіі». 2007 год.
**1.30** Маст. фільм «Мары насустрач».

### EUROSPORT

**5.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Найлепшыя моманты.
**6.00, 0.15, 1.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**8.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**10.00, 12.45, 15.00, 16.45, 4.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**10.30** WATTS!
**10.45, 15.45** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**12.00, 14.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**13.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**19.45, 23.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**21.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**2.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.50, 22.00, 3.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.25** Камедыя «Снежная нявеста».



**8.00** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**10.35** Камедыя «Выкрутасы».
**12.20** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
**14.00** Камедыя «Чалавек-эльф».
**15.40, 0.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «Па той бок».
**18.45** Камедыя «Ох, ужо гэты водпуск».
**20.20** Камедыя «Канікулы ў Грэцыі. Усё ўключана».
**23.10** Меладрама «10 дзён, каб закахацца».
**1.15** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
**3.55** Камедыя «Блізня».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Дачныя гісторыі».
**11.05** «Сто пытанняў даросламу».
**11.55** «Prокіно».
**12.05** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.55** «Доказ віны».
**13.30, 1.15** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**17.20** «Кароль Леў». М/ф.
**18.45** «Лінія абароны».
**19.20** «Жанчына, не схільная да авантур». Маст. фільм.
**21.25** «Пяты элемент». Маст. фільм.
**23.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Так рана. Так позна». Дак. фільм.

### ТБ1000

**7.05** Драма «Рамэа і Джульета».
**9.10** Драма «Разня».
**10.35** Меладрама «Муж і жонка Морган ва ўцёках».
**12.25** Драма «Паганіні: Скрыпач Д'ябла».
**14.30** Драма «Перш чым я засну».
**16.10, 4.55** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць II: выдатная і небяспечная».
**18.10, 1.10** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**20.00** Камедыя «Мары спраўджваюцца!».
**21.50** Камедыя «Дарослая нечаканасць».
**23.30** Камедыя «З 5 да 7. Час палюбоўнікаў».
**2.50** Драма «Полак».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
**8.10** Камедыя «Ад 180 і вышэй».
**9.55, 11.40** Фантастыка «Паляўнічы».
**13.30** Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
**15.10** Трылер «Індыга».
**16.50** Драма «Дуэль. Пушкін — Лермантаў».
**18.50** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**20.20** Баявік «На гульні».



**22.10** Камедыя «Кахае — не кахае».
**0.00** Трылер «Уцекачы».
**1.45** Дэтэктыў «Дачка».
**3.35, 4.50** Прыгоды «Вязень замка Іф».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.50** Займальная навука.
**7.15, 8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Узлом Сістэмы.
**8.00** Код небяспекі.
**9.20** Золата Юкана.
**10.10** Голая навука.
**11.00** Навука будучыні Стывена Хокінга.
**11.50** Космас: прастора і час.
**12.40, 17.40** Прарыў.
**13.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.20** Дзень «Д».
**15.10** Сіла племені.
**16.50** Па тонкім лёдзе.
**18.30, 19.50** Шырокі погляд.
**20.10** Гонка да Паўднёвага полюса.
**21.00, 1.10, 4.30** Эвакуацыя Зямлі.
**21.50, 2.00, 5.15** Найгоршае надвор'е ў гісторыі?
**22.40, 2.50** Уварванне на Зямлю.
**0.20, 3.40** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 15.15, 6.25** Махінатары.
**8.50** Мяцежнікі ледзянога возера.
**9.45** Смяротны ўлоў.
**10.40** Драпежнікі буйным планам.
**11.35** Гаражнае золата.
**12.30, 20.00, 0.00** Стальныя хлопцы.
**13.25** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**14.20** Мяцежны гараж.
**16.10, 1.00, 5.35** Кубінскі хром.
**17.05, 4.50** Нябачныя светы.
**18.00, 4.00** Як стварыць біянічнага чалавека.
**19.00** Цуды Сусвету.
**23.00** Дзікая кухня.
**2.00** Голыя і напалоханыя.
**3.00** Хуткія і гучныя.
**7.13** Трой.

---

## У свеце гаджэтаў

### НА ГЭТЫМ ЛОЖКУ НЕ ПРАСПІШ

**Вядомы сваімі нечаканымі рашэннямі англійскі вынаходнік-энтузіяст Колін Фарз (водаправодчык па асноўнай прафесіі) парадаваў свет новай распрацоўкай, якую ў адпольквай ступені можна назваць і бліскучай, і вар'яцкай.**



Гэта ложак, які не пацерпіць ніякіх «ну яшчэ пяць хвілінак» і ў літаральным сэнсе скіне з сябе гаспадара. Ён сапраўды незаменны для тых, каго не абудзіць ніякім будзільнікам: ложак проста скіне соню на падлогу без лішніх цырымоній, і ўсё. Мала таго, у яго ёсць яшчэ і некалькі рэжымаў. Самы «мяккі» — гэта калі вы проста саслізгваеце на падлогу, ну а самы жорсткі — гэта калі ложак «выстрэльвае» вамі пад страшны грукат і выццё аўтамабільнай сірэны. Так што, хто не хоча праспаць, можа паспрабаваць пад'ём па методыцы англійскага вынаходніка-водаправодчыка.

### Я БАЧУ, КУДЫ ТЫ ГЛЯДЗІШ!

**Амерыканскі дызайнер і архітэктар Бенас Фарахі стварыла накідку, здольную змяняць сваю форму.**



Выраб быў выкананы з дапамогай 3D-друку. Накідка выглядае як шкура дзікабраза: яна пакрыта іголкамі, пад якімі знаходзіцца відэакамера. Адзенне рэагуе на погляд чалавека супрацьлеглага полу. Калі сістэма вызначыла чалавека ў кадры як дарослага мужчыну, які пільна глядзіць на грудзі, то паверхня гэтай накідкі адразу ж пачынае свой рух. Добрая рэч: феміністкі могуць змагацца з мужчынскімі поглядамі шляхам закрыцця сваіх формаў, а какеткі, наадварот, падкрэсліваць постаць і прыцягваць увагу.

### СМАРТФОН СОЧЫЦЬ ЗА СЕКСАМ УЛАДАЛЬНІКА

**Адзін з флагманаў у сферы вытворчасці камп'ютараў і мабільных прылад — знакамітая кампанія Apple — дабавіла магчымасць сачыць за сексуальнай актыўнасцю ўладальнікаў сваіх гаджэтаў з дапамогай дадатку «Здароўе».**



Праграма ўсталёўваецца аўтаматычна пры новым абнаўленні прашыўкі. З дапамогай гэтай навінкі можна будзе сачыць за сексуальнай актыўнасцю ўладальніка гаджэта. У новым дадатку ёсць магчымасць фіксаваць дату кожнага палавога акта, яго працягласць, а таксама якасць сексу. Уся атрыманая інфармацыя будзе адлюстроўвацца ў смартфоне ў выглядзе графіка або табліцы. Напрыклад, як у падобных дадатках, дзе лічыцца колькасць крокаў ці калорый. Так што смартфоны ўсё больш і больш будуць ацэньваць людзей.

## Zамор'е

### ДЭВІД СЦІПЛЫ

**Часопіс «People» прызнаў былога капітана зборнай Англіі па футболе Дэвіда Бэкхэма самым сексуальным мужчынам сярод тых, якія жывуць цяпер.**




Каментуючы свой выбар, зроблены без якой-небудзь метадалогіі і на аснове асабістых пераваг рэдакцыі, «People» назваў уладальніка тытула «сусветнай суперзоркай, адданым мужам і практычным бацькам чацвярых дзяцей». «Гэта велізарны гонар, і мне вельмі прыемна яго прыняць», — заявіў 40-гадовы спартсмен, прызнаўшыся, што не лічыць сябе годным дадзенага звання. «Я ніколі не адчуваю сябе прывабным, сексуальным чалавекам», — адзначыў «сціплы» мача. Ён дадаў, што, тым не менш, сапраўды любіць «насіць добрую вопратку і добрыя касцюмы, выглядаць і адчуваць сябе добра». Дэвід Бэкхэм з'яўляецца самым вядомым спартсменам або, прынамсі, футбалістам, вядомым і ў свеце моды — яго твар і цела літаральна «прапісаліся» на старонках сусветных модных часопісаў свету ў апошнія гадоў 10—15. Лічыцца, што тэрмін «метрасексуал» мае сваё паходжанне менавіта ад стылю і вобраза жыцця Дэвіда.

### КОТ — ГЕРОЙ ГОДА

**Ката Нале са Швецыі, які выратаваў гаспадыню ад пажару, прызналі героем года сярод жывёл, пра што паведамляе The Local Sweden.**



Нале разбудзіў сваю гаспадыню, 23-гадовую Ані Нарвефош з горада Карлскруна, у момант, калі пастаўлены ёю на зарадку мабільны тэлефон пачаў дыміцца. Дзяўчына распавяла, што, калі яна ачуняла, адчула пах гарэлага пластыку і кінулася ліквідаваць узгаранне. Пасля гэтага здарэння кот стаў улюбёнцам шведскіх карыстальнікаў сацсетак, а потым папулярнасць прывяла яго і Ані на тэлебачанне. Канал SVT уручыў Нале ганаровую грамату і прызы (у прыватнасці, стыльны ашыйнік, цацкі і ежу).

### МУЖЧЫНА, КУПІЦЕ ПУЧОК... ВАЛАСОЎ!

**Не паспеў свет прывыкнуць да мужчынскіх касічак, як у продаж паступілі... накладныя мужчынскія пучкі для валасоў. І ўжо выклікалі бурную рэакцыю, асабліва сярод шакаваных жанчын. А фірма сэрвіс скідак Groupon абвясціў зніжку на «адзін з самых гарачых трэндаў мужчынскай моды».**



Купіць гэтыя «модныя штучкі» можна за $9,99 замест ранейшых $65,34. Пучкі прадаюцца ў трох колерах: для бландзінаў, брунетаў і шатэнаў. Карыстальнікі сацыяльных сетак, у асноўным дзяўчаты, тым часам здзіўляюцца гэтаму факту і пытаюцца, ці жарт гэта, а таксама рэагуюць фразамі кшталту «Першая прыкмета апакаліпсісу? Так, гэта канец», «Спыніце. Гэта» і г.д.

**Іван КУПАРВАС**

## НЯДЗЕЛЯ, 29 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20** Меладрама **«Не адпускай мяне». 2-я серыя.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** Гісторыі рамонту.
**10.25** «50 рэцэптаў першага».
**11.05** XXL WOMAN TV.
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50** Меладрама **«Абмяняйцеся кольцамі».**
**17.40** Меладрама **«Дачакацца кахання».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Клуб рэдактараў.
**22.35** Навіны надвор'я.
**22.55** Камедыя **«Практыкаванні ў выдатным».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў». Італія.
**8.05** Серыял **«Хто ў доме гаспадар?».**
**10.05** «Арол і рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**11.05, 21.35** Хачу ў тэлевізар!
**11.15, 20.05** Тэлебарометр.
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Пяцёрачка.
**12.10** Серыял **«Мая цудоўная нянька».**
**13.45** Баявік **«Тры ікс 2: новы ўзровень». ЗША.**
**15.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Змяшаная эстафета. Супермікс.
**16.45** Капейка ў капейку.
**17.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Змяшаная эстафета.
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.10** Дэтэктыў **«Метад Фрэйда 2».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**23.20** Меладрама **«Іншаземка».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30, 12.25, 18.25, 0.10** «Калейдаскоп».
**7.45, 12.40, 18.40, 0.25** «Размовы пра духоўнае».
**7.55, 21.55 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.30 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Дэтэктыў.**
**11.45** «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Андрэй Лугін, Людміла Міцэвіч, Міхаіл Бараноўскі.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.20** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**14.15** «Музеі Беларусі». Магілёўскі абласны мастацкі музей імя Паўла Масленікава.
**14.45** «Гітара па крузе». Канстанцін Арбенін, паэт, пісьменнік.
**15.35 «Залатое цяля». Камедыя.**
**18.55 «Вачамі прывіду». Меладрама.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Неюбілейны вечар Ісаака і Максіма Дунаеўскіх». Канцэрт.
**23.30** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Джэймс Бонд. Таямніца агента 007». Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.35, 22.45** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Звыш 105 кг.
**9.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Звыш 75 кг.
**11.15** Баскетбол. НБА. «Сан-Антоніа» — «Атланта».
**12.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Саўтгэмптан».
**14.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Чэлсі».
**17.00** Авертайм.
**17.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.55** Гандбол. Кубак ЕГФ. 3-ці кваліфікацыйны раўнд. Матч у адказ. СКА (Беларусь) — «Хард» (Аўстрыя)
**19.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Суёнсі».
**21.25** Канькабежны спорт. Кубак Беларусі.
**22.55** Хакей для ўсіх.
**23.35** Баскетбол. НБА. «Кліперс» — «Мінесота».

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.40** «Фазэнда».
**11.15** «Брэйн-рынг».
**12.25** «Барахолка».
**13.10** «Госці па нядзелях».
**14.10** Да 100-годдзя Канстанціна Сіманава. «Чакай мяне, і я вярнуся».
**15.10, 16.20** «Усе хіты «Гумар FM».
**16.15** Навіны спорту.
**17.00** «Кропля ў кроплю».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Голас».
**23.05 Толькі для дарослых. Трылер «Метад». Сеанс шосты.**
**0.05 Маст. фільм «Ідучы ў адрыў».**

### СТБ

**6.35 «Афрамасквіч 2». Серыял.**
**7.25** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.45, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.10 Трылер «Абсалютная ўлада».**
**10.15** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 7». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.15 Маст. фільм «Федра».**
**15.40** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20 Маст. фільм «Край».**



**19.30** «Тыдзень».
**20.25** «Ваенная тайна».
**22.40** «Ігар Талькоў: прысуджаны». Дакументальны спецпраект.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** М/ф.
**6.50 Маст. фільм «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».**
**8.35** «Ведаем рускую».
**9.30** «Нітка да ніткі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Чаму я?»
**10.45 Серыял «Фёдараў», 1—4 серыі.**
**14.15 Маст. фільм «Жаніцьба Бальзамінава».**
**16.15 Серыял «Адзін на ўсіх», 1—4 серыі.**
**19.45, 22.00 Серыял «Зноў адзін на ўсіх».**
**21.00** «Разам».
**0.15 Маст. фільм «Два дні».**
**1.55 Маст. фільм «Фанфан-цюльпан».**
**3.50** Дак. фільм «З нагоды».
**4.35 Маст. фільм «Музычная гісторыя».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 13.20** «ХА». Маленькія камедыі.
**7.35 Маст. фільм «Пад знакам Месяца».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**14.15** «Пакой смеху».
**14.50 Маст. фільм «Яго каханне».**
**18.00** «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя птушка».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30 Серыял «Ціхі Дон».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая передача».
**11.00** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «Паедзем, паядзім!»
**14.05** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе адбурыць!
**15.00, 16.20 Серыял «Час Волкава».**
**18.00** «Акцэнты тыдня».
**18.55** «Кропка».
**19.45 Серыял «Павуцінне».**
**23.15** «Прапаганда».
**23.45** «Генерал». Дак. фільм.

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.30, 19.00, 23.35** «На-двор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 14.20, 15.50, 20.55** «Хатняя крама».
**10.45 Баявік «Аблога».**
**12.35 Маст. фільм «Цёмная тэрыторыя».**
**14.30** М/ф.
**16.20 Серыял «Каломба».**
**18.00** «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.05 Баявік «Кандагарскі прарыў».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Іаана — жанчына на папскім троне».**

### ВТБ

**6.00** «Хатняя кухня».
**6.30** «Вялікая маленькая зорка».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Кухня 5».
**14.30** Серыял «Апошні з Магікян».
**16.00, 23.15, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**17.00** Камедыя «Дапсекі Бога 3: місія Задыяк».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.30** Фэнтэзі «Іншы свет».
**0.00** «Кіно ў дэталях».
**3.30** «Лаві момант».
**4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**5.00** Серыял «Сваці».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** Кінастудыі імя М. Горкага — 100! «Кашчэй Бессмяротны». Маст. фільм.
**11.40** «Краіна чараўніка Роу». Дак. фільм.
**12.20** «Расія, любоў мая!» «Культура табасаранцаў».
**12.50** «Хто там...»
**13.20** «Дзікая Паўднёвая Афрыка. «Вялікая пяцёрка». Дак. фільм.
**14.10** Геніі і ліхадзеі. Гаўрыіл Ілізараў.
**14.35** «Пешшу...» Масква сакральная.
**15.05** «Дзік Трэйсі». Маст. фільм.
**16.45** «І сяброў збяру... Барыс Пакроўскі». Вечар у Доме акцёра.
**17.25, 1.55** «Шукальнікі». «Цёмная гісторыя белага каменя».
**18.15** Да 90-годдзя з дня нараджэння Ноны Мардзюковай. «Камісар». Маст. фільм.
**20.00** «Больш, чым каханне». «Нона Мардзюкова. Пра каханне без шчасця».
**20.40** «Ціхі Дон». Здымкі на фоне эпохі». Дак. фільм.
**21.25** Па слядах тайны. «Загадкавыя продкі чалавецтва».
**22.15** Да 100-годдзя з дня нараджэння Канстанціна Сіманава. « Паслухайце!.. Канстанціну Сіманаву прысвячаецца...».
**23.35** «Ка. Эм.». Дак. фільм. Частка 2-я.
**0.30** «Магістраль». Маст. фільм.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1988.
**7.00, 9.40, 11.00, 13.00, 14.20, 17.15, 18.40, 19.20, 21.15, 23.20, 0.55, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Дак. фільм «Мора нашай надзеі».
**8.45. 2.45** Кінасачопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**13.30** Дак. фільм «Старыя майстры».
**15.00** «Быў час». 2008 год.
**16.00** Маст. фільм «Між высокіх хлябоў».
**18.00** «Акулы пяра». «Іванушки International». 1997 год.
**19.00** Дак. фільм «Хто за сцяной?».
**21.00** Дак. фільм «Мода 89—90».
**22.00** Маст. фільм «Небяспечныя гастролі».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. Дзмітрый Грыгор'еў і Ірына Хрысціянава. 2007 год.
**1.10** Маст. фільм «На вастрыі мяча».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».

### EUROSPORT

**5.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**7.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**8.00, 21.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**9.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Лепшыя моманты.
**10.00, 12.45, 16.30, 19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**10.30** WATTS!
**10.45, 14.15** Лыжнае двая-бор'е. Кубак свету.
**12.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**13.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**15.45, 17.15** Біятлон. Кубак свету.
**19.45, 22.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**0.00, 0.55** Конны спорт. «Перавага коней».
**0.05** Конны спорт. Кубак свету.
**1.0. 3.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.40, 22.00, 3.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.25** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**8.00** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
**10.35** Меладрама «Па той бок».
**12.20** Камедыя «Ох, ужо гэты водпуск».
**14.00** Камедыя «Два з палавай жуліка».
**15.40, 0.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «10 дзён, каб закахацца».
**18.45** Камедыя «Канікулы ў Грэцыі. Усё ўключана».
**20.20** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе».



**23.10** Камедыя «Мытня дае дабро».
**1.15** Камедыя «Выкрутасы».
**3.55** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.30** «Дачныя гісторыі».
**10.00** «Нераскрытыя тайны».
**10.55** «Паненка і кулінар».
**11.30, 1.15** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**14.55** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.20** «Самазванка». Маст. фільм.
**19.45, 5.25** «Без падману».
**20.35** «Спячыя». Маст. фільм.
**23.15** «Асцярожна, махляры!»
**23.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.10** «Жыццё на пантах». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.50, 5.20** Баявік «Прывідны гоншчык».
**8.55** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**10.45** Драма «Добрай ночы, Месяц».
**12.15** Драма «Вельмі добрыя дзяўчынкі».
**13.45** Камедыя «Мары спраўджваюцца!».
**15.35** Фэнтэзі «Гары Потэр і ордэн Фенікса».
**17.50, 1.15** Меладрама «Іспанска-англійская».
**20.00** Меладрама «Даю год».
**21.40** Драма «Джо».
**23.40** Трылер «Жанчына ў чорным».
**3.30** Камедыя «Дом Хэмінгуэй».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Прыгоды «Вязень замка Іф».
**8.00** Меладрама «Вечнае вяртанне».
**10.10** Прыгоды «Што ў Сенькі было».
**11.40** Драма «Я не вярнуся».
**13.20** Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».
**15.10** Баявік «22 хвіліны».
**16.40** Трылер «Вій».
**18.50** Камедыя «Кахае — не кахае».
**20.20** Баявік «На гульні 2. Новы ўзровень».
**22.10** Меладрама «Адночы».
**0.10** Драма «Брэсцкая крэпасць».
**2.25** Драма «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
**3.35** Камедыя «Год цяляці».
**5.00** Трагікамедыя «Пра жонку, мару і яшчэ адну...».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.50** Займальная навука.
**7.15, 8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Узлом Сістэмы.
**8.00** Код небяспекі.
**9.20** Асушыць акіян.
**10.10** Голая навука.
**11.00, 20.10** Навука будучыні Стывена Хокінга.
**12.40, 21.00, 1.10** Прарыў.
**13.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.20** Дзень «Д».
**15.10** Топ-10 мегамонстраў.
**16.00** Зграя.
**16.50** Асветленая бездань.
**17.40, 18.30, 19.20** Дзікае надвор'е.
**21.50, 2.00, 5.15** Даследчык 2.0.
**23.30, 3.40** Забароны.

### DISCOVERY

**8.00** Стальныя хлопцы.
**8.50, 17.05, 21.00, 4.00, 5.35** Голыя і напалоханыя.
**10.40** Дзікая кухня.
**11.35** Як стварыць біянічнага чалавека.
**12.30** Нябачныя светы.
**13.25, 4.50** Цуды Сусвету.
**14.20, 22.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**15.15, 23.00** Эфект Карбанара.
**16.10,0.00** Трой.
**20.00** Драпежнікі буйным планам.
**1.00** Мяцежны гараж.
**2.00** Акулы аўтатаргоў з Далаcа.
**3.00** Хуткія і гучныя.

■ Нашы дзеці

# Бывай, інтэрнат!

## Ад таго, якім будзе чыёсьці дзяцінства, залежыць наша старасць

**У Беларусі на выхаванні ў замяшчальных сем'ях знаходзіцца больш як 17 000 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Яны страцілі родную сям'ю, але трапілі ў іншую, якая дасць ім вопыт і прыклад сямейнага жыцця, што ў далейшым станоўча паўплывае на іх сацыяльную адаптацыю ў грамадстве. Іншая справа — выпускнікі інтэрнатных устаноў, якія такіх умоў не мелі, таму здольнасць іх да адаптацыі зніжана...**

З гэтай і не толькі прычыны ў Беларусі шырока практыкуецца праграма дэінстытуцыяналізацыі — забеспячэння сямейнымі формамі выхавання дзяцей, якія страцілі свае родныя сем'і. Зараз у нашай краіне толькі 20% дзяцей-сірот жывуць у інтэрнатных установах, астатнія 80% уладкаваны на розныя формы сямейнага выхавання. Некаторыя рэгіёны паказваюць яшчэ лепшыя вынікі: у Гомельскай вобласці ва ўмовах замяшчальнага сямейнага клопату жыве 87% дзяцей, у Магілёўскай — 84%, у Гродзенскай — крыху менш за 84%, а ў 28 раёнах Беларусі ўжо ўвогуле не існуе сацыяльна-педагагічнай практыкі накіравання дзіцяці ў інтэрнат — малых адразу перадаюць у сем'і.

*— Дзеці, што выпускаюцца з інтэрнатных устаноў, на жаль, выходзяць з утрыманскімі поглядамі і комплексам пасіўнага чакальніка сацыяльных паслуг. Моладзь у сучасным жыцці сустрэне шмат цяжкасцей: вялізная канкурэнцыя ва ўсіх сферах, ёй трэба быць запатрабаванай на рынку працы, валодаць якасцямі, якія дазволяць быць ужыўчывым, талерантным, здольным мець стасункі з рознымі людзьмі. А інтэрнатная сістэма гэтаму не спрыяе,* — лічыць **Наталля ПАСПЕЛАВА, дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення**. *— Упэўнена, што праграма па ўладкаванні дзяцей на сямейную форму выхавання накіравана на паляпшэнне нашай нацыі. Дзеці — гэта будучыня народа. І ад таго, у якіх умовах яны жывуць і з чым пойдуць у самастойнае жыццё, залежыць шмат, як мінімум наша старасць.*

Актуальныя пытанні па абароне правоў дзяцей у Беларусі агучыла **Маргарыта МАЦВЕЕНКА, начальнік аддзела сацыяльна-педагагічнай працы і аховы дзяцінства Міністэрства адукацыі.** Гэта ўдасканальванне нематэрыяльнай падтрымкі замяшчальных сем'яў і распрацоўка мадэлі іх суправаджэння (у тым ліку падрыхтоўка кадраў, якія б суправаджалі працу замяшчальных бацькоў). Яна звярнула ўвагу і на прафілактыку звяртання дзяцей з замяшчальных сем'яў.

*— Такія выпадкі адзінкавыя, але ж яны ёсць, а прафілактыка заўжды лепшая за іншыя сродкі. Вялікую ўвагу Міністэрства адукацыі надае станаўленню ўсвядомленага бацькоўства. Гэта вельмі важна, бо з нараджэннем дзіцяці чалавек не атрымлівае адразу веды, як яго выхоўваць: гэтаму трэба вучыць і суправаджаць сем'і.*

Дзяржаўная падтрымка мацярынства дазволіла стварыць у Беларусі ўмовы для нараджэння здаровага дзіцяці. Такую думку выказаў **Канстанцін ВІЛЬЧУК, дырэктар рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця»**.

Усе дзеці атрымліваюць бясплатную медыцынскую дапамогу па прафілактыцы, дыягностыцы і лячэнні захворванняў, а таксама рэабілітацыі. Бясплатнымі лекамі забяспечваюцца малыя з такімі захворваннямі, як цукровы дыябет, туберкулёз, эпілепсія і бранхіяльная астма.

*— Сістэма перынатальнай дапамогі маці і дзецям, якая больш за 15 гадоў існуе ў Беларусі, дазволіла значна знізіць паказчык смяротнасці немаўлят. Цяпер выжывае 82% нованароджаных з экстрэмальна нізкай вагой. А ў Дзіцячым цэнтры анкалогіі і імуналогіі ў Бараўлянах выжывае больш за 75% дзяцей, якія пакутуюць ад вострага лімфабластнага лейкозу, што адпавядае паказчыкам міжнароднага ўзроўню, — зазначыў ён. — Сацыяльная падтрымка станоўча ўплывае і на нараджэнне, якое павялічваецца на 2-3% штогод. Летась на свет з'явілася больш як 118 000 немаўлят, за кошт чаго зменшыўся паказчык натуральных страт насельніцтва, звузіліся дэмаграфічныя «нажніцы» нараджэння і смяротнасці.*

**Ірына СІДАРОК**



**За бягучы год 188 000 дзяцей апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы. З прычыны пагрозы жыццю і здароўю з сем'яў забрана 32 960 дзяцей.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» 01.12.2015 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями по продаже *имущества, принадлежащего ОАО «Могилевхимволокно»***

| | | Адрес | Начальная цена продажи с учетом НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| **ЛОТ №1 Сведения об имуществе, входящем в состав лота** | **Капитальное строение с инв. № 700/С-49068 – Главный корпус ДМТ-2,** общ. пл. 20 455,0 кв.м<br>Земельный участок с кадастровый номером 740100000005004841, площадь 0, 9922 га | г. Могилев, пр-т Шмидта, 45 | **3 065 440 000** |
| **ЛОТ №2 Сведения об имуществе, входящем в состав лота** | **Капитальное строение с инв. № 700/С-49089 – Корпус промежуточных емкостей ДМТ-2**, общ. пл. 3084,9 кв.м<br>Земельный участок с кадастровый номером 740100000005004842, площадь 0,6635 га | г. Могилев, пр-т Шмидта, 45/32 | **614 040 000** |
| **ЛОТ №3 Сведения об имуществе, входящем в состав лота** | **- Капитальное строение с инв.№ 700/С-74544 – Производственные площади прядильно-отделочного цеха № 1 ЗСВ, Производственные площади цеха нетканых материалов № 1,** общ. пл. 49 487,9 кв.м<br>- Вспомогательные сооружения согласно перечня;<br>Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000005001828, площадью 222,9991 га | г. Могилев, пр-т Шмидта, 45 | **18 117 512 345** |
| **ЛОТ №4 Сведения об имуществе, входящем в состав лота** | **- Изолированное помещение с инв. № 700/D-129313 – Помещение изолированное бытового корпуса с медпунктом**, общ. пл. 4860,3 кв.м<br>- Вспомогательные сооружения согласно перечня;<br>Земельный участок с кадастровый номером 740100000003006371, площадь 0,9474 га | г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105Д-2 | **2 672 947 708** |
| **Сумма задатка и расчетный счет для его внесения** | **Задаток в размере 5% от начальной цены лота** перечисляется на р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509, получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» | | |
| **Продавец** | ОАО «Могилевхимволокно» | | |
| **Организатор аукциона** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» МОУ, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29 | | |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | 01 декабря 2015 года, 13.00, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29 (офис МОУ Филиал «Центр «Белтехинвентаризация») | | |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе и внесения задатка** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» МОУ, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29, 30 ноября 2015 года до 15.00 включительно | | |
| **Условие аукциона** | Победитель аукциона обязан в течение 2 месяцев со дня регистрации перехода права собственности на капитальное строение выполнить работы по устройству ограждения по периметру приобретенного земельного участка | | |

*Извещения о предыдущих аукционах были размещены в газете «Рэспубліка» в номерах от 02.07.2015 г., 05.08.15 г., 04.09.15 г., 07.10.15 г., в газете «Звязда» от 07.11.15 г.*

**Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (8-0291) 400-394 vel.; (8-029) 624-26-25; bti9@inbox.ru**



## velcom информирует об изменении стоимости услуг связи и увеличении количества минут и объема интернет-трафика на популярных тарифных планах

В течение 2015 года компания velcom продолжила активно инвестировать в развитие инфраструктуры, расширение географии покрытия, улучшение качества услуг связи, внедрение новых сервисов. По итогам 10 месяцев 2015 года были сданы в эксплуатацию 195 новых объектов связи, что позволило обеспечить 93,8% населения услугами 3G на базе передовых технологий HSPA+/HSDPA.

Несмотря на существенные капитальные вложения в дорогостоящее импортное оборудование и значительный рост издержек, связанный с изменением обменного курса национальной валюты, компания velcom не производила корректировки тарифов в 2015 году, оказывая услуги по ценам 2014 года. Дальнейшее удержание тарифов на уровне 2014 года могло бы оказать негативное влияние на инвестиционные возможности компании, поэтому с 1 декабря 2015 г. будет произведена корректировка стоимости услуг связи.

Повышение тарифов затронет абонентскую плату тарифных планов, исходящие национальные голосовые вызовы, международные вызовы (за исключением линейки ПРИВЕТ), тарифы на специальные и дополнительные услуги, премиум-SMS, услуги передачи данных и роуминг.

Следует отметить, что абонентская плата на большинство тарифных планов вырастет на 3 000 – 8 000 рублей. Так, например, на тарифных планах Smart 1, Smart 2 и Smart 3 повышение составит 8 000 рублей.

Одновременно, будут существенно модифицированы популярные продукты для смартфонов: в два и более раза увеличится объем включенного в абонентскую плату голосового трафика и значительно (от 11 до 45%) снизится стоимость внутрисетевых вызовов на тарифных планах Бизнес+, BUSINESS.PRO, Smart Премьера, Smart 1, Smart 2, Smart 3.

**Увеличение объема голосового трафика**

| Наименование тарифного плана | До 1 декабря 2015 г. | | После 1 декабря 2015 г. | |
|---|---|---|---|---|
| | Особенности тарифного плана | Руб./мин. внутри сети | Особенности тарифного плана | Руб./мин. внутри сети |
| Бизнес+ | 500 минут внутри сети | 179 | **1000 минут внутри сети** | **159** |
| BUSINESS.PRO | 800 минут внутри сети | 139 | **2000 минут внутри сети** | **109** |
| Smart Премьера | 500 минут на 5 «любимых» номеров | 389 | **безлимит на 5 «любимых» номеров, 300 минут внутри сети** | **269** |
| Smart 1 | 200 минут во все сети | 365 | **600 минут во все сети** | **199** |
| Smart 2 | 500 минут во все сети | 175 | **1500 минут во все сети** | **109** |
| Smart 3 | 250 минут внутри сети | 139 | **600 минут внутри сети** | **99** |
| Корпоративный Smart Премьера | 500 минут на 5 «любимых» номеров | 319 | **безлимит на 5 «любимых» номеров, 300 минут внутри сети** | **269** |
| Корпоративный Smart 3 | 250 минут внутри сети | 139 | **600 минут внутри сети** | **99** |

Кроме того, ряд голосовых тарифных планов получит дополнительный объем интернет-трафика: 50 МБ появятся в тарифном плане «На связи»; в тарифные планы «Дела семейные», «Своя сеть», «Новый стандарт», «Корпоративный 1000 Индивидуальный» будут включены по 250 МБ.

Также с 1 декабря 2015 г. вступает в действие новый порядок обслуживания абонентов: будет введена единая поминутная тарификация и изменится порядок расходования голосового трафика, включенного в абонентскую плату, при звонках на «Любимые номера».

Без изменений останутся размеры ежемесячных платежей за оборудование, приобретенное в рассрочку, SMS, MMS, стоимость видеовызова, абонентская плата и стоимость мегабайта актуальных тарифных планов линейки WEB, стоимость пакетов мобильного интернета и интернет-трафика голосовых тарифных планов, а также абонентская плата и голосовые вызовы тарифного плана «Социальный».

Ознакомиться с новыми предложениями по тарифным планам можно будет 1 декабря 2015 года на сайтах www.velcom.by и www.privet.by, а также по телефонам справочно-информационной службы 411 (круглосуточно, звонки с мобильного телефона в сети velcom без взимания оплаты).

УНП 101528843

# БЕЗ СУМЛЕННЯ, СОРАМУ І ВІНЫ...

## Яны маюць патрэбу ў дапамозе псіхіятра, але рэдка звяртаюцца па яе самастойна

**Верагодна, кожны з нас сутыкаўся з людзьмі з дзівацтвамі, з рознага роду арыгіналамі або з кімсьці з цяжкім характарам. І з невытлумачальнымі ўчынкамі навакольных, якія парою не ўкладваюцца ў галаве. З людзьмі, якія лёгка парушаюць маральныя забароны, не адчуваючы пры гэтым ніякіх згрызот сумлення. Напэўна, усе чулі ці чыталі аб злачынствах, ад якіх стыне кроў у жылах і ў галаве толькі адно пытанне: як такое ўвогуле магчыма? Так, часам магчыма, кажуць псіхіятры. І тлумачаць, чаму.**

### НЕ ПРОСТА ЦЯЖКІ ХАРАКТАР ЦІ ДРЭННАЕ ВЫХАВАННЕ...

По адным з такіх нашумелых злачынстваў у канцы кастрычніка ў Гомелі суд агучыў прысуд. Ён датычыўся маці-забойцы, якая ўтапіла ў ванне сваіх дзяцей — 11-месячную дачку і 2-гадовага сына. Псіхолага-псіхіятрычная экспертыза дыягнаставала ў абвінавачванай дыссацыяльнае расстройства асобы. Пры гэтым эксперты сцвярджаюць, што гэтая жанчына цалкам усведамляла характар сваіх дзеянняў і іх наступствы. Што ж гэта за дыягназ такі — расстройства асобы, і ці шмат людзей пакутуюць ад яго?

— Раней людзей з расстройствам асобы называлі псіхапатамі, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па пагранічнай псіхіятрыі гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера г. Мінска, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Наталля БЕРАЗОЎСКАЯ.** — Менавіта гэты тэрмін быў ва ўжыванні ў псіхіятраў аж да 90-х гадоў мінулага стагоддзя. З цягам часу гэтае слова шырока ўвайшло ва ўжытак і стала хадзячай назвай. Паняцце «псіхапат» у побыце мы ўжываем, калі гаворым пра чалавека, паводзіны якога значна адрозніваюцца ад паводзін большасці людзей, прычым не ў лепшы бок, або не задавальняюць нас.

Але цяпер тэрмін «псіхапатыя» са слоўніка псіхіятраў знік. У сучаснай класіфікацыі псіхічных расстройстваў і расстройстваў паводзін выкарыстоўваецца тэрмін «расстройства сталай асобы».

Калі казаць коратка, расстройства асобы можа быць ядзерным, калі маюць месца і спадчынныя фактары, і няправільнае выхаванне. У гэтым выпадку прыкметы расстройства выяўляюцца з дзяцінства і практычна не паддаюцца карэкцыі. А вось пагранічнае расстройства асобы звязана, як правіла, з асаблівасцямі выхавання, праявы яго не такія відавочныя і лепш паддаюцца карэкцыі.

Псіхіятры гэтым тэрмінам вызначаюць цэлую групу расстройстваў, іх сапраўды шмат. Так, чалавек з трывожным расстройствам асобы для навакольных даволі бяскрыўдны. Людзі з паранаідальным расстройствам асобы на фоне «ўзорных паводзін» становяцца вельмі недаверлівымі і падазронымі, і, як правіла, вельмі цяжкія ў зносінах.

Але нас у гэтым выпадку больш за ўсё цікавіць дыссацыяльнае расстройства, як у прыведзенай у пачатку артыкула маці-забойцы, бо ён — самы небяспечны. Людзі з падобным адхіленнем ігнаруюць нормы і правілы, якія існуюць у грамадстве. Таму сярод іх часта можна сустрэць асоб, якія ўчынілі правапарушэнні і злачынствы. Наогул, галоўнымі дыягнастычнымі прыкметамі такога расстройства асобы псіхіятры называюць поўную адсутнасць сумлення, схільнасць да падману і няздольнасць выконваць грамадскія нормы. Такіх людзей характарызуюць бессардэчная абыякавасць да пачуццяў іншых, няздольнасць адчуваць віну і атрымліваць карысць ад жыццёвага вопыту, схільнасць абвінавачваць навакольных і даваць добрапрыстойныя тлумачэнні сваім паводзінам, якія прыводзяць да канфлікту з грамадствам.

Дыссацыяльнае расстройства асобы спецыялісты яшчэ называюць сацыяпатыяй. У сацыяпатаў не фарміруецца здольнасць адчуваць прыхільнасць да іншых людзей, у першую чаргу да сваіх родных, яны не ўмеюць спачуваць, схільныя рабіць людзям балюча і лічаць слабакамі ўсіх, хто не гатовы даць ім адпор. Але спецыялісты папярэджваюць, што сацыяпатыю варта адрозніваць ад сацыяльнай дэзадаптацыі. Пры апошняй тыя ці іншыя эмацыйныя расстройствы (зніжаны настрой, трывога, неспакой, ажыятацыя або ўспышкі агрэсіўнасці) узнікаюць у чалавека толькі сітуацыйна, у сувязі са значнымі зменамі ў жыцці, у стрэсавай сітуацыі — пры страце блізкага або працы, расстанні з каханымі, сур'ёзным захворванні і г.д. У першым выпадку такія паводзіны ад сітуацыі не залежаць.

### ЦІ МОЖНА «ВЫЛІЧЫЦЬ» САЦЫЯПАТА?

Натуральна, узнікае пытанне, як распазнаць падобнага чалавека.

— Я восем гадоў выкладала ў медыцынскім універсітэце, — расказвае Наталля Беразоўская. — Гэтая тэма — адна з самых складаных для тлумачэння студэнтам. Тут няма відавочных парушэнняў псіхічных функцый: няма галюцынацый, трызнення. У такіх людзей ёсць пэўныя асаблівасці мыслення, але не настолькі відавочныя. Асноўныя парушэнні назіраюцца ў эмацыйна-валявой сферы і паводзінах, узаемаадносінах з іншымі людзьмі.

Варта звяртаць увагу на хлусню, беспрынцыповасць, агрэсіўнасць, паводзіны, якія ідуць насуперак з агульнапрынятымі. Дарэчы, кожны чалавек інтуітыўна імкнецца адсунуцца, дыстанцыявацца ад падобных асоб.

Ведаеце, калі размаўляеш са злачынцамі, якім пастаўлены такі дыягназ... Маладыя людзі, гадоў 20-22-х, расказваюць пра сваё жыццё, і, слухаючы іх, міжволі адчуваеш жах. Ужо ў такім узросце ў іх жыцці можа прысутнічаць мноства цяжкіх гісторый. Яны могуць трапіць у поле зроку міліцыі і псіхіятраў за ўдзел у жорсткім збіванні або забойстве. Пытаешся: можа, гэта адбылося імпульсіўна, можа, абставіны так скласіся? Не, яны спакойна расказваюць пра тое, як загадзя планавалі сваё злачынства. Некаторыя пакідаюць ураджанне пра сябе як пра людзей, якім гэта дастаўляе нават пэўнае задавальненне. Яны ніколі не адчуваюць віны, жалю!

***— Але спецыялісты пішуць, што сацыяпаты могуць быць і вельмі абаяльнымі. І разбураюць жыцці іншых людзей, не знішчаючы іх фізічна, а пускаючы пад адхон іншымі спосабамі: падстаўляючы пад удар альбо прыводзячы да банкруцтва, руйнуючы асобу іншага чалавека і ўсё, што яму дорага...***

